

яраслаў
пархута

ТЫ ПАЙШЛА Ў СОНЦА



ВЫДАВЕЦТВА
«МАСТАЦКАЯ
ЛІТАРАТУРА»
МІНСК 1973

ЛІРЫЧНЫЯ
АПОВЕСЦІ
І
НАВЕЛЫ

яраслаў пархута

•

ты пайшла ў сонца



Бел 2
П 18



П $\frac{0733\text{-}051}{М302(05)\text{-}73}$ 79-73



лірычныя аповесці



БУСЛЫ ВЯРТАЮЦЦА З ВЫРАЮ

Кузня стаіць пасярод вёскі, пад старой таполяй. Верхнія пракураныя вянцы разышліся — у шчыліну можна прасунуць руку. Яны, тыя шчыліны, былі і даўней, яшчэ да вайны... Калі, бывала, награвала сонца падрубы, мурашкі ланцужком узбягалі на цёплую сцяну і губляліся ў тых шчылінах. Васіль не раз прыносіў бацьку полудзень, ставіў гладыш кіслага малака на кавадла, накрываў зверху акрайцам аржанога хлеба, а сам бег паглядзець на тых мурашак. Яны заўсёды былі занятыя незразумелым для яго клопатам. І, каб аблегчыць ім тое турботнае жыццё, заўсёды частаваў хлебнымі крошкамі.

Цяпер мурашкі звяліся ці перабраліся ў больш надзейнае месца. І калі зацвітае таполя, белы пух закanaпачвае тыя шчыліны. Здаецца тады, нібы хто зашпакляваў іх ватай. Сама кузня ў такія дні набывае яшчэ больш старэчы выгляд — быццам абрастае мохам. Бо тыя пушынкі чапляюцца абы за што, а зямлю наўкол укрываюць нібы снегам.

Адчыняецца кузня рэдка, а галасістае кавадла пяе толькі калі-нікалі. На цэнтральнай сялібе калгаса ўзвялі дабротную майстэрню, і Васіль ездзіць туды слясарыць амаль кожны дзень. А спатрэбіцца якая пільнасць — Макар-

брыгадзір просіць яго застацца дома, каб быў пад рукою. І ён прыходзіць сюды, распальвае стары горан. Іншы раз у такія дні заходзяць са сваім клопатам жанкі, і кузня ажывае, весела звініць кавадла. Кабеты ўвесь час, пакуль занятьі Васіль, сядзяць пад таполяй і вядуць нетаропкую бяседу.

Ён ведае нават, пра што ідзе гамонка ў такія хвіліны. Пачынаюць звычайна здаля — пра свае хатнія справы. Потым перакінуцца на іншае — на лён ці на буракі, паскардзяцца адна другой на няўпраўку, на няхватку рук, упікнуць сяготаго, што пакінуў вёску, і, нарэшце, спыняюцца на ім, Васілю. І хоць бабы пачнуць хваліць яго: маўляў, у бацьку пайшоў, на сэрцы ўсё ж будзе прыкра.

Асабліва ён злаваў на сябе ўчора, калі ў кузню забегла Верка. Ведаў, што Палашчына дачка пасля доўгай адлучкі прыехала ў вёску, і баяўся трапіць ёй на вочы. А яна ўзяла і прыбегла. Пастаяла ў дзвярах, паглядзела, як ён увіхаўся з молатам, і мяккім голасам сказала:

— Васілько! Ты — Праметэй!..

І па-дзіцячы, гарэзна засмяялася.

Падумалася тады: нашто жарты такія?

З'явіўся Анціп — Васілёў добраахвотны памочнік,— і Верка пакінула капа́чку, каб адцягнулі лязо, і пайшла. Толькі растрывожыла ў ім тое, даўняе...

Васіль патаптаўся ля кузні, акінуў вокам усланы пухам дол і адчыніў дзверы. Сеў на парог, дастаў з нагруднай кішэні «беламорыну» і падумаў: «А можа, дарэмна і злую на Верку? У кожнага свае шляхі-дарогі...»

Прыгадаўся выпадак, які звёў іх на доўгія гады.

З такімі, як сам, падшыванцамі пабег аднойчы Васіль на Быстрыцу, да затокі, што выгіналася блішчастай падковай у канцы вёскі. Плёскаліся ў цёплай вадзе адчайна — з вясёлым смехам і гоманам. Потым папрыбягалі дзяўчаткі — іхнія аднагодкі — і паселі табунком, як ластаўкі, на беразе. Пачалі ўпрошваць:

— Дайце і нам скупнуцца!

Але яны ўпарціліся — не вылазілі з вады. Настойлівымі былі і ластаўкі. Сядзелі — і ні з месца. А калі ў хлопцаў пасінелі жываты, пачалі ўжо самі прасіцца ў дзяўчат:

— Адзежу нашу... у сітнік... занясіце!..

Ластаўкі сарваліся з наседжанага месца, гэляцелі, размахваючы хлапечымі штонікамі, і так жа хутка вярнуліся назад. Тады хлопцы выбеглі з вады і пашпарылі ў той сітнік.

Ужо добра адышліся ад ракі, як раптам пачулі лямант. Ён далятаў з затокі. «Топяцца!» — падумаў тады Васіль і кінуўся назад. Не распранаючыся, у чым быў — плюхнуўся ў ваду...

Тапілася Верка. Першае, што ён убачыў, калі яна вынырнула,— гэта вочы. Спалоханыя.

Васіль тады за косы выцягнуў Верку на бераг. Дзяўчаткі, забыўшыся пра свой сорам, нема дрыжэлі на пяску і апамяталіся толькі тады, як ачуняла сяброўка...

З таго дня яны здружыліся.

Ішоў апошні год вайны.

Раніцою да іх забегла цётка Палашка:

— Гануля! — загукала Васілёвай маці.— Я наважылася злётаць у Баравую. Сяструха абяцала солі пазычыць... То няхай Верка папалудне ў цябе.

Потым прыбегла Верка, і яны падаліся на

загуменне гуляць у схованкі. Там да самай стадолы падступаў густы зараснік ядлоўцу і нізкарослых бярозак. Васіль падкінуў лазовы дубец, Верка на ляту перахапіла яго рукою. Вышэй яе рукі легла Васілёва. Потым — Верчына. Потым — зноў Васілёва. Верка засмяялася: кончык дубца прыйшоўся на яе руку. Гэта значыла, Васілю першаму трэба станавіцца на тыя пошукі.

Але да сотні Васіль не далічыў. Недзе там, за лагчынай, дзе праходзіў гасцінец, грымнуў выбух, а потым — другі, прыглушаны і меншы. Васіль азірнуўся: з пагорка ляцела Верка і крычала:

— Гарыць! На гасцінцы!..

Выбягаць на пагорак не адважыліся. Ці мала што... Раптам Верка спытала:

— Глядзі? Што гэта?

Дарогаю з лагчыны нехта ішоў у вёску. То прысядаў да самай зямлі, нібы падаў, губляючыся ў рэдкіх кустах, то зноў выпростваўся...

— Чалавек!— прашаптала Верка.— Гэта чалавек...

Цяпер і Васіль добра бачыў, што гэта быў чалавек. Але хто? І чаго так дзіўна ідзе? І ў адзежыне падазронай, незвычайнай...

Чалавек параўняўся з канцавой хатай і ўпаў ля плота. Чаго б гэта? Разбірала цікаўнасць. Перасільваючы страх, спусціліся ўніз і картапленнем падпаўзлі амаль да самай вуліцы.

— Ён жа... распрануты,— прашаптала Верка.— І чырвоны... Нібы ў крыві...

Чалавек застагнаў, прыўзняўся на руках і выцяўся аб шула галавой. Па чорным, як галавешка, твары пабеглі чырвоныя ручайкі.

У Васіля паміж лапатак нібы забегалі му-

рашкі. Верка, збялелая, са страхам у вачах глянула на яго і выдыхнула:

— Б-божачкі...

Аднекуль сярэдзінай вуліцы плёўся дзед Сымон. Убачыў распластанага ў пяску чалавека і спыніўся, хвіліну вычакаў, падышоў. Нечакана апынуўся там і кульгавы Гнат, прыбеглі мужчыны, бабы.

Чалавек глуха застагнаў, зноў прыўзняўся з зямлі і зноў выцяўся галавою аб шула. А потым прастагнаў:

— О, майн гот!..

Тады Васілёў дзед сказаў:

— Гэта ж фашыст...

Дзед Сымон падышоў да ляжачага, нахіліўся. А той, нібы ўбачыўшы перад сабою збавіцеля, ухапіў дзеда за руку і папрасіў:

— Мэссэр... Гіб мір... мэссэр...

— Зарэзацца хоча,— сказаў нехта.

Мужчыны адышлі на другі бок вуліцы, бліжэй да картаплення, і пачалі раіцца:

— Трэба завалачы ў ядловец...

— А калі даведаюцца?

— А хто скажа пра тое?

— Завалачэм — і шыта-крыта...

Прыбег аднекуль вясковы пастух Анціпка:

— На бальшаку легкавушка падарвалася... Дагарае... А немцаў пазабівала насмерць...

Мужчыны, здавалася, і не слухалі яго:

— То што будзем рабіць?

Пакуль яны раіліся, прыплыла і старая Тэкля, вядомая на ўсю акругу шаптуха, з бутэлькаю алею і старым кужэльным прасцірадлам, загаласіла:

— Што ж гэта вы надумалі, людзі! Ён — тожа чалавек!..

Раптам, нарабіўшы пылу на ўсю вуліцу, з-за павароту выляцеў грузавік. Гэта было так нечакана, што ніхто з вяскоўцаў не паспеў крануцца з месца.

У момант фашысты акружылі натоўп, адціснулі далей ад плота. Афіцэр вырваў з рук Тэклі намочанае ў алеі прасцірадла, кінуў аднаму з салдат і пачаў нешта крычаць, паказваючы то на абпаленага, што стагнаў і курчыўся пад плотам, то ў бок гасцінца.

— Уцякаймо! — прашаптала Верка. — Яны нас пазастрэльваюць!

Разораю папаўзлі назад. Потым кінуліся за стадолу, туды, дзе пачынаўся ядловец, перабеглі імшарнік і затаіліся ў зарасніку за выганам. І тады пачулі прыглушаную страляніну.

А потым з боку вёскі шуганула ў неба вобла-ка чорнага дыму...

Неба ўжо добра ўсыпалася зорамі, а яны ўсё яшчэ сядзелі ў тым зарасніку. Слухалі, як у вёсцы вылі сабакі, і ад страху і невядомасці ажно прабіралі дрыжыкі. Нарэшце адважыліся перабрацца бліжэй да селішча. Калі падняліся на пагорак, — зжахнуліся. Там, унізе, дагаралі агромністыя кастры. На месцы Верчынай стадолы таксама курылася вогнішча... А яны стаялі і глядзелі, як паволі тухлі кастры , і не маглі зрушыць з месца.

Раптам як з-пад зямлі вырас перад імі Анціпка:

— Спалілі-пабілі ўсіх чыста... Спалілі-пабілі...

Ён па старой звычцы заляпаў рукой аб руку і дадаў:

— Няма вашай палавіны... Да кузні ўсю вёску спалілі...

І заплакаў — дзіка, не па-чалавечы.

Яны павярнулі назад. Не пайшлі туды, дзе па левую руку ад таполі стаялі прыцішаныя ўцалелыя хаты, а падаліся ў бок Баравой. Калі выбраліся на сцежку, што вяла ў тую вёску, сутыкнуліся з цёткай Палашкай. Яна бегла насустрач і галасіла:

— А людкі ж мае!.. А што гэта робіцца на свеце?!

Палашка кінулася на грудзі Анціпку і зайшлася слязьмі. Потым, нібы ачнулася, упала на калені перад Веркай, прыгаворваючы:

— А дзіцятка маё! А ці праўда, што ты засталася жывая?.. А ці праўда гэта?..

Да цёткі Маланні, дзе яны прыткнуліся ў тую ноч, насыходзілася поўная хата людзей. Усе дапытваліся:

— Як тое сталася, Анціпка?

І Анціпка ў каторы раз расказваў, як зганялі фашысты людзей — старых і малых, як зачынілі потым у Верчынай стадоле, як дзед Сымон з кульгавым Гнатам выдралі ў сцяне дошку, як праз тую дзірку сыпануў натоўп, як усчалася страляніна, як дзед Сымон кінуўся з віламі на салдата, і той стрэліў яму ў грудзі, як потым доўга лямантавалі ў палаючай стадоле жанкі з малымі дзецьмі...

Лежачы на печы, Васіль заціскаў вушы, каб не чуць ні голасу Анціпкі, ні тае праўды. Яму не верылася... Здавалася, адчыняцца дзверы і ў хату ўбяжыць маці, прыпадзе да яго, супакоіць. Але дзверы не адчыняліся, і чуцён быў толькі голас Анціпкі:

— А я ўцёк... А я ўпаў у копанку, што з-над бульбы...

Анціпка змоўк, перастаў ляпаць рукой аб

руку, і падалося, што ў хаце нікога няма. Васіль прыўзняўся і з-за коміна паглядзеў уніз. Моўчкі сядзелі старыя дзядзькі, выціралі вочы ражкамі хустак жанкі. І раптам тую цішыню разарваў неверагодны вокліч:

— Не аддавайце немцам! Не выдавайце!..

— Анціпка! — суцяшалі жанкі.— Табе падалося! Тут усе свае. Не бойся!..

— Свае? — перапытаў Анціпка, спалохана аглядаючы людзей.

— Свае, бараўскія! — сказала цётка Малання і падышла да яго.— Табе адпачыць трэба.

Яна падвяла яго да печы. І Анціпка паслухаўся — моўчкі палез да Васіля.

...Змардаваны ўсім перажытым, Васіль заснуў толькі пад ранак. Прачнуўся раптоўна, нібы хто тарkануў у плячо. Спусціўся на падлогу і выйшаў на ганак. Сонца ўдарыла ў вочы, асляпіла. Але праз хвіліну прызвычаіўся і ўбачыў ля свіронка Анціпку — ён пілаваў папярочкаю альховае бервяно.

— А дзе ўсе, дзе Верка? — занепакоіўся Васіль.

Анціпка выцер далоняй твар:

— Пайшлі хаваць нашых... А Верка — там! — паказаў на вішняк.

Васілю здаўся Анціпка незвычайным. Яго вочы глядзелі не прыдуркавата, а ўважліва, сур'ёзна, без ранейшага незразумелага бляску і каламуты. Ён не ляпаў цяпер рукой аб руку і гаварыў, як сапраўдны дарослы чалавек.

Прыбегла Верка і падала Васілю грудку залацістага вішнёвага клею:

— Смаката!

Але Анціпка падышоў да Васіля, забраў клей і шпурнуў за плот, у крапіву:

— Яго есці няможна!

Верка здзіўлена паглядзела на Васіля:

— Хадзем...

Зайшлі за хату, селі на прызбу і маўчалі, утрапёныя раптоўнай пераменай Анціпкі...

...Ужо добрую кучу Анціпка напілаваў дроў, як вярнуліся цётка Малання і Верчына маці. Першым азваўся Анціпка:

— Кажаце, пахавалі?..

Нібы нажом разанулі тыя словы па сэрцы. Яно зайшлося, а свет засланілі слёзы. Васіль не вытрымаў і кінуўся з падворка. Напрасткі, праз поле пабег у сваю вёску. Не верылася ў тое, што бачыў учора. Здавалася, кастры ў тую месячную ноч былі не ад хат, а што іх пакінулі на зямлі незвычайныя начлежнікі. Здавалася, што гэта быў сон...

Узляцеў на пагорак і зразумеў: не, гэта не сон быў. Па правую руку ад кузні чарнела суцэльнае пажарышча, уздымаючы ў неба даўжэзныя каміны. Спусціўся туды, дзе стаяла яшчэ ўчора Верчына стадола, і ўбачыў крыху воддаль свежы пясок. Над курганком высіўся невялікі крыж, збіты з абгарэлых аполкаў. На месцы іхняй хаты сярод пажарышча стаяла вялізная печ ды валяліся недагаркі бярвенняў. Адзіная яблыня ўздымала ўгору чорныя абпаленыя галіны.

Падцяўшы хвост, падворкам шмыгануў дзедаў Лыска, спраставаў Верчына гумнішча, спыніўся ля свежай магілы і завыў — жалобна і працяжна...

...Васіль адчуў, як акурак папяросы апёк пальцы. Кінуў яго пад ногі, нейкі час глядзеў на пызы дымок. Нядобра было на сэрцы. «З куры-

вам трэ завязваць! — падумаў.— І Макар нешта позніцца...» Падняўся, прайшоў да вуліцы, глянуў у адзін бок, у другі — брыгадзіра не было відаць. Здзівіўся: як адрозніваецца іхняя палавіна вёскі ад левай! Там — роўная вуліца з амаль новымі дамамі, пад шыферам ці гонтай, з акуратнымі гародчыкамі. А на левай палавіне, якая ўцалела ў той страшны дзень, пракідаліся там-сям яшчэ старыя хаты. І хоць саламяныя стрэхі былі даўно перакрыты,— хаты мелі выгляд не такі вясёлы. І стаялі ўпрытык, прыдарожаныя да самай вуліцы. «Зямлі шкадавалі, таму і будавалі так»,— успомніў бацькавы словы і тут жа ўдакладніў: «Не было яе, зямлі. Не ў кожнага яе хапала... Можа, толькі ў таго Казі...»

Зноў усплылі ў памяці малюнкі тых даўніх часоў.

Дзед неяк рашыў аддзяліць іхнюю сям'ю. Купіў старую сялібу ў Казі-асадніка, які даўно збудаваўся на ладным кавалку зямлі і жыў на водшыбе, за вясковымі гародамі. Маўчаў Казя толькі да вясны, а калі адсеяўся,— пачаў цяганіну. Прыходзіў да іх вечарам і нэндзіў:

— От які свет пайшоў, пся крэў! — пачынаў здаля Казя.— Ĭрападзеш! Нехта быдлам маргі са два хлеба стаптаў. Нутро адбіў бы, каб ведаў хто.

А потым дадаваў:

— Ты, Пятро, усё-ткі знясі халупу. Там якраз зямля пад каноплі. Золата — не зямля! На яе цаны няма! І ў купчай пра тое не абгаворана...

— Як жа! — спрабаваў пярэчыць бацька.— Мы ж дамаўляліся, што з тым кавалкам зямлі... усю сялібу...

— Пся крэў! З зямлёю! Яе я і за трыста злотых не аддам!

Бацька злаваўся на такую несправядлівасць, а потым махнуў рукою — сказаў, што сабярэцца з грашыма і да зімы перасыпле хату непадалёку ад кузні, на выгане. Але зрабіць гэта яму не ўдалося.

Ішла якраз сенажаць. Дзед узяў у солтыса Банэдыка на дзесятую долю лапіну поплава. У той дзень маці з Васілём зграбалі сена, а бацька, кінуўшы кавальскую справу, знасіў яго на грудок і складаў у капіцы. Прыбегла бабка Мар'яна.

— Пятрусь! — закрычала яна.— Ідзі дадому! Там цябе чакаюць Банэдык з паліцыянтам. На ровары прыехаў з павета...

На аселіцу бацька не вярнуўся. Не прыйшоў ён дадому і назаўтра. Толькі пазней даведаліся яны, што ён у «картузцы»...

Да Васілёвага слыху даляцеў рокат матора. Азірнуўся: з пагорка, напрасткі праз выган спускаўся на матацыкле брыгадзір. Здалёк усміхнуўся, выключыў матор, счакаў, а калі Васіль падышоў — падаў яму шырокую далонь:

— Добра, што чакаеш! Й на пілараме забавіўся!

Васіль і без таго бачыў, што Макар едзе адтуль — у люльцы ляжалі, шчэрачы рэдкія зубы, дзве ржавыя тартачныя пілы.

— Добрыя апілкі! — пахваліў брыгадзір.— Гачкі адмысловыя будуць! Не тое, што з учарашніх рысораў!..

Лепшага матэрыялу на гачкі і не трэба. З такой сталі бацька некалі рабіў і серп, і ножык, і брытву. Бабы ў крыўдзе не будуць...

— Чаго ты? — занепакоіўся брыгадзір, падазрона зірнуўшы на Васіля.

— От! — няпэўна адказаў ён.

— Кінь ты! І гэта патрэбна! Як бабам без гачак? Цяперака няма чаго такарыць, а гачкі прагэтыя самыя ў горле ажно сядзяць,— і ён правёў далоняй па кадыку, нібы паказваючы, як яны там у яго сядзяць. Васіль усміхнуўся, уявіўшы брыгадзіраву бяду, і сказаў:

— Ладна! Давай лепш закурым!..

...Клопаты пра тую хату ўзяў на сябе дзед.

— Збірай, маці, лахі! — аднойчы сказаў ён бабцы.— Павязу цялушку ў павет. Падсуну адвакату — адстоіць праўду!

Вярнуўся з павета ён зацемкам. Борздзенька шпурнуў пугаўё ў закутак і, не скідаючы каптана, паважна ўсеўся на покуце.

— Вось! — пачаў дзед гаворку.— Не падмажаш — не паедзеш... Прыйшоў, значыцца, да адваката, кажу: так і так... Прывёў, кажу, гасцінец, каб заступіўся за нас. Адказвае: добра, Сымоне, добра! Пазнаёмлюся, кажа, глыбей са справай, і ўсё, значыцца, будзе ў адпаведным парадку!..

— Не верыцца! — сказала маці.— Не такі Казя! І трэба ж было прагледзець, што пісалася ў той купчай!..

Яна мела рацыю. Бо хутка адбыўся суд, які вынес рашэнне: або выплаціць за пляц, або Казя абрэжа сялібу па самыя вокны.

На трэці дзень ля хаты тварыўся вэрхал. Доўгі, як жэрдка, асаднік стаяў пасярод падворка і рагатаў:

— Ну што, пся крэў! На чыім баку праўда?

Маці — у лямант:

— Злітуйся! Мы грошы плацілі. Потам заробленыя...

— І-і! — пішчаў асаднік.— Плацілі! А дамаўляліся як? У мяне і сведкі ёсць!..

Яны сядзелі ў цяньку, пад таполяю, прысланіўшыся да тоўстага камля. Васіль зрабіў доўгую зацяжку і нечакана спытаў:

— Слухай, Макар! А хто тады выдаў бацьку?..

— Калі? — не зразумеў брыгадзір, падумаў, затушыў запалак і перапытаў:— Перад вайною? Хвароба яго ведае!..

Два чужыя дзядзькі — Казевы родзічы, скінуўшы камізэлькі, пачалі разбураць паркан. Асаднік, стоячы воддаль, падбадзёрваў:

— Пся крэў! Да вечара скончым — ладны кілішак будзе!

Падышлі суседзі — цётка Палашка, кульгавы Гнат, дзед з бабкаю — усе ўзіраліся, як завіхаўся ля хаты Казя, перашэптваліся. Асаднік адмерыў ад сцяны адзін крок і скамандаваў:

— Тут капай, пся крэў!

Прыцягнулі шулы і ўкапалі якраз у тым месцы, дзе толькі што таптаўся асаднік. Іх пазбівалі жэрдкамі і пачалі абшываць аполкамі.

Пад'ехаў солтыс. Паважна сышоў з вазка і накіраваўся да Казі:

— Маё шанаванне!

— Дзень добры, пан Банэдык!

— Што тут робіцца?

— А ніц! Хату не зносяць галадранцы! То я, пся крэў, адгароджваю...

Солтыс хітравата падкруціў чорны, як ластаўчына крыло, вус:

— Адмыслова!
— А што я — лыкам шыты?!

Васілёвы ўспаміны перарваў брыгадзір:
— У нас ячэйка была падпольная,— сказаў ён.— На Першае мая фокус адзін адкалолі — павесілі сцяг. Вось на гэтую таполю...
Макар падняў галаву, нібы хацеў паглядзець, як тады палыхаў сцяг над вёскай, потым павярнуўся да Васіля і дадаў:
— Мяне першым узялі. Бацьку твайго — пазней крыху... Асаднік, мабыць, пранюхаў... Добра, што не доўга давялося... А то пакармілі б вошай...

«Адмыслова!» — паўтарыў, ідучы да вазка, Банэдык, ляпнуў рукою па хромавым партфелі і сказаў Васілёвай маці, нібы толькі цяпер заўважыў яе.— Тут у мяне ад Пятра твайго ліст. Дашлі каго ўвечары, аддам.
...Бацька пісаў, што адбыўся суд і яго будуць трымаць пакуль што ў Картуз-Бярозе, а потым адашлюць кудысьці далей. Ён яшчэ прасіў, каб маці дабілася дазволу і наведала яго да пакровы.
Але той векапомны верасень паставіў усё з галавы на ногі.

— Тады ты пацаном быў,— чуўся брыгадзіраў голас.— А мо і помніш, якімі вярнуліся?
Васіль помніў. Спачатку ў вёску панаехала рускіх салдат. На танках. Праз два дні з'явіўся і бацька. Схуднелы, ён здаваўся стомленым, але вочы свяціліся вясёлым агнём. Сказаў, пераступіўшы парог:
— Ну вось! І на нашай вуліцы свята!

Назаўтра з дзедам яны пачалі разбіваць той плот. Дзед увесь час молада лаяўся:

— Ядры яго корань! Адгарадзіўся! Каб яму, значыцца, на тым свеце гарадзілі!..

Праз тыдзень Казю і Банэдыка некуды забралі.

Бацька адчыняў раніцай кузню, і вясёлы перазвон зноў чуцён быў над вёскай цалюткі дзень. Ля кузні заўсёды было зборышча. Ішлі сюды і тыя, каму і не было такой пільнай патрэбы. Бо патаўчыся сярод сваіх, паслухаць гамонку, падзяліцца ўчутай навіной — была патрэба кожнага. Васіль таксама днямі прападаў ля кузні, слухаў гаворку мужчын і здзіўляўся, што называлі яны бацьку не Пятром, а Сымонавічам...

— Талковым быў мужыком! — даляцелі, нібы здалёк, Макаравы словы.— I рукі залатыя меў...

А ў Васілёвай памяці паўставаў ужо той дзень, калі ў апошні раз бачыўся з бацькам. Гэта было недзе праз месяц, як спалілі іхні канец вёскі. Жыў Васіль з Веркай і Верчынай маці ў яе бараўской сяструхі. Вёска стаяла ў лесе, далёка ад вялікіх дарог, і немцы туды рэдка калі патыкаліся... Аднойчы прыйшоў бацька з атрада і сказаў: «Хадзем!» I яны напрасткі падаліся ў сваё Заполле.

— Мне ў кузню трэба,— растлумачыў ён, калі мінулі гароды.— Спружына ў нагане паляцела... Ты пакруцішся на выгане, а я тым часам...

Аднаму сярод ночы было страшнавата. У левым канцы сяла час ад часу скуголіў сабака, наводзячы на Васіля тугу.

Нешта з гадзіну пакруціўся тады на выгане. Прысядаў, узіраўся ў бязлюдную дарогу, што шэрай паласой цякла ў насцярожаную цемру, а самому ўсё рупіла зазірнуць у кузню. Нарэшце адважыўся і падаўся туды.

Бацька корпаўся пры блеклым святле «жучка». Не адрываючыся ад занятку, спытаў:

— Як там? Спакойна?

— Спакойна! — прашаптаў Васіль.

— То і добра,— ціха прамовіў бацька.— Засталося толькі загартаваць... Ад гарту, брат, усё залежыць... Калі ён талкова зроблены, то...

Ён не дагаварыў, падышоў да горна, раздзьмуў невялічкае цяпельца і, пачапіўшы на драціну нейкую драбязу, пачаў награваць. Калі яна набыла залацісты колер, выхапіў з полымя і апусціў у бляшанку. У паветры запахла гарэлым алеем. Потым бацька зноў, цяпер ужо ў абцужках, паднес пружыну да агню. Чырвоныя языкі злізалі з яе алей і згаслі. Тады пачала рабіць сваю справу бярозавая трэска. Яна некалькі разоў прайшлася па спружыне і высекла з яе жоўтыя іскры.

Васіль бачыў, як бацька, прыжмурыўшы левае вока, пільна сачыў за паводзінамі спружыны. Улучыўшы патрэбны момант, схапіў прыпашаную, разрэзаную на дзве палавінкі цыбуліну і хуценька пацёр ёю спружыну, сказаў: «Баста!» — і разгарнуў горан...

Пачуліся паспешлівыя крокі — нехта шыбаваў да кузні. Васіль хацеў азірнуцца, каб паглядзець — хто гэта, але хутка пазнаў Анціпаву хаду і не варухнуўся, застаўся сядзець, як і сядзеў.

Анціп здаля загаманіў:

— Лячу і думаю: спазніўся! А вы, бачу, загараеце!

— А пакурылі-такі! — адказаў Макар і падняўся.— Заседзеўся ў цябе, Васіль... Трэба ж на балота. Хутка сенкаваць пачнём... З Баравой...

Брыгадзір паехаў. Праз хвіліну за пагоркам знік яго матацыкл.

— Во! Гэта дзела! — паказаў Анціп на пілы.— Распаліць горан, ці як?

— Распалі! — адказаў Васіль.— Да вечара трэба ўправіцца...

Чутно было, як зачмыхаў, а потым пачаў ажно захлынацца, нібы ў задышцы, стары горан. І Васіль падумаў пра свайго памочніка: «Талковы!..»

...Тады, лежачы ў бараўской Маланні на печы, Васіль нечага баяўся Анціпкі, хоць і ведаў, што той не зробіць яму нічога благога. Ён жа, як тое дзіця, быў заўсёды бяскрыўдны і безабаронны. А парушыўся некалі розум, што нарачоную выдалі за іншага, і яна, не стрываўшы такога, наклала на сябе рукі... Гаварылі, што пасля таго здарэння з яго каханай, сірата-Анціп ушчэнт занядбаў сваю сялібу, седма сядзеў у хаце — перастаў нават выходзіць на людзі. А выйшаў — усе заўважылі, што з хлопцам нешта зрабілася. Ён неяк дзіўна ляпаў рукой аб руку і ўсміхаўся ўсім, без разбору. Пазней Анціпка стаў вельмі патрэбным чалавекам — вясковым пастухом. Жыў у людзей па чарзе, пасучы кароў. Не браў аніякай платы ад гаспадароў, а даволіўся тым, што меў хоць які пражытак пры іх. Не адмяняўся гэты няпісаны закон і пасля пакровы, калі выпадаў снег і выганяць скаціну з хлява не было ніякага сэнсу. А ён, як

і раней, сталаваўся па калейцы ў кожнай запалянскай хаце...

Помніў жа... Ведаў... А спалохаўся тады, на печы. Назаўтра, уражаны раптоўнай пераменай пастуха, адчуванне меў яшчэ горшае. Вочы Анціпкі глядзелі на свет без ранейшай каламуты, голас быў спакойны, рукі не ляпалі адна аб адну... І гэта было яшчэ больш нязвыклым.

А потым усё стала на месца.

У Верчынай цёткі Васіль пражыў да самага вызвалення. Калі ўсё ўгаманілася, з'явіўся Анціп і забраў яго да сябе.

— Не прападзём! — падбадзёрыў ён.— А дваім зручней будзе!..

Анціпава хата тулілася на левым ускрайку Заполля, там, дзе ў якіх ста кроках некалі пачынаўся панскі сервітут. Яны сяк-так агоралі тую хаціну — прывялі ў больш-менш нармальны стан занядбалую будыніну, агарод і пачалі перабівацца. У той нялёгкі год іх карміў лес, рака, іншы раз па старой звычцы прыносілі Анціпу немудроны харч суседзі, але больш выручала кузня — бацькава спадчына. Васіль здзіўляўся незвычайнай знаходлівасці і ўпартасці гэтага чалавека да работы. Без лішніх слоў браўся ён за незнаёмую справу і заўсёды даводзіў яе да канца. Гэтаму вучыў і Васіля.

Яны злаўчыліся адліваць з алюмінію лыжкі, патэльні, рабілі з іржавых касак складанчыкі, якіх, чамусьці, называлі тады па ўсёй акрузе «немчыкамі». За выручаныя грошы можна ўжо было тое-сёе набыць у раённай краме — соль, газу, якую-небудзь адзежыну.

Восенню Анціп сказаў:

— Табе вучыцца трэба!

Як цяпер помніць Васіль той незвычайны

дзень. Напярэдадні ішоў дождж. Неба вымылася, што стала празрыстым — прасвечвалася да самага дна. Сонца, ледзь адарваўшыся ад небакраю, весела плыло ў блакіт і не па-асенняму ярка свяціла.

Яны стаялі на ганку і радаваліся ранішняй чысціні і свежасці. На Васілёва плячо лягла вузлаватая рука:

— Ну, з богам! — сказаў Анціп і правёў да веснічак.

Вуліца нібы яшчэ песцілася ў ціхай дрымоце, прыкрываючы засенню прысад хаты. А тыя, хоць і спрасоння, але ўжо даверліва глядзелі на свет сінімі вокнамі. Васіль прагна ўдыхаў настоенае на вішнёвым лісці паветра і крочыў у бок школы...

Васіль падняў з зямлі пілы і пайшоў у кузню. Анціп стаяў ля верстака і, трымаючы ў руках пабітую шчарбінамі Верчыну капа́чку, запытаўся:

— Як яна там? Так і жыве?..

— Адкуль я ведаю! — нібы зазлаваў Васіль, а сам сабе дадаў, успомніўшы пра таго «Прametэя»: «Вось як бывае! І не згадаеш, як іншы раз паверне цябе, якім бокам паставіць... То ж і мяне ледзь не перакантавала...»

...Пасля звальнення Васіль не паехаў, як некаторыя, у горад, а вярнуўся сюды, у Заполле, у Анціпаву хату. Пайшоў у праўленне і папрасіўся ў кавалі. Не адмовілі, толькі спыталі:

— А не ўцячэш?

Васіль не адказаў, здзіўлены такім недаверам. А потым усё ж уцёк. І ў гэтым, лічыў ён, была вінавата Верка.

...Нешта праз месяц пасля таго, як прызначылі кавалём, Макар падбіў яго напісаць у газету пра сваіх перадавікоў. Выбраўшы зручную хвіліну, калі не было ў хаце Анціпа, выканаў брыгадзіраву просьбу і адправіў тое пісьмо ў рэдакцыю. Хутка атрымаў адказ. Чытаў і не верыў вачам сваім. Вера Гаўрыленка, тая самая Верка, пісала, што ў іх раённай рэдакцыі спадабалі Васілёў артыкул. «Калі я сказала, што ты — мой зямляк, рэдактар вырашыў запрасіць цябе на працу. Прыязджай! — заканчвала свой ліст Верка.— Чакаем!»

Паехаў, рады такому. Толькі дарогай дакараў сябе, што з войска не здагадаўся напісаць Верцы. «А яна, бачыш, не забылася пра мяне!» — разважаў тады Васіль. Калі Верка пазнаёміла яго са сваім мужам — сакратаром рэдакцыі,— выкінуў з галавы такую думку. Аднак пашкадаваў: «Бімбус намнога старэйшы. Чаму ж гэта яна так... за лысага?..»

Пачаліся новыя клопаты, бяссонныя ночы. Раніцай прыходзіў на работу і напісанае паказваў Верцы. Аднойчы, прачытаўшы ў газеце яго замалёўку пра адну даярку, Верка падбегла да Васіля, аберуч схапіла яго руку і не дала апамятацца:

— Віншую! Гэта — поспех!..

А потым — была лятучка. Гаварыў Бімбус.

— Хіба гэта матэрыял, таварышы? — ледзь не крычаў сакратар.— Замест таго, каб адразу за рогі схапіць тэму!..— ён памаўчаў, паглядзеў на Васіля і дадаў:— Чаму не пачаць так: «Стаўшы на працоўную вахту...» І далей трэба было, таварыш Запалянскі...

Але ён, утрапёны такой нечаканасцю, не мог улавіць сэнсу тае гаворкі. Паглядаў то на Бім-

буса, то на Верку, то на рэдактара, то на свайго загадчыка і нічога не разумеў. А калі сакратар скончыў сваё выступленне і даўкая цішыня напоўніла кабінет, апамятаўся, падняўся і моўчкі пакінуў кабінет.

Прыйшоў на сваю кватэру і кінуўся ў ложак у чым быў, як падкошаны. У галаве роем насіліся думкі. Адна змяняла другую, нязвязна, бесталкова. «А мо сапраўды, пісака з мяне...» І вінаваціў у сваім няўдалым дэбюце Верку: «Гэта ж яна адарвала ад зямлі, яна...»

Пасля той бяссоннай, трывожнай ночы, ледзь заднела, сабраў свае халасцяцкія пажыткі, разлічыўся з гаспадыняй і ціхім завулкам, каб, крый божа, ніхто не заўважыў яго, падаўся на аўтобусную. У паштовую скрынку кінуў пісьмо. Кароткае. У некалькі радкоў. У ім паведаміў Верцы аб сваім рашэнні.

Балюча было на сэрцы. Нудота ела поедам усю дарогу. І толькі тады стаў адлятаць гэты боль, як пераступіў знаёмы парог. Выслухаў Анціп яго споведзь і спытаў:

— А цяперака што надумаў рабіць?

Васіль прамаўчаў.

— Хай яны, тыя гарады! — падбадзёрыў Анціп.— Тут жыць зручней. Свая і хата, і бульбіна...

Пацяклі дні, поўныя нялёгкіх турбот. Ішоў у кузню раніцой, а вяртаўся дадому вечарам, як п'яны. Гуло ў вушах, свінцом наліваліся рукі. А ледзь заднее — зноў бег сюды, у кузню, і дацямна зноў увіхаўся ля кавадла...

—Ахалонь! — сказаў Анціп, глянуўшы на Васіля.— А я тым часам тую капáчку...

Васіль не пайшоў пад таполю на ўлюбёнае месца, а ўсё стукаў малатком, нібы хацеў за-

глушыць успаміны. Але перад вачыма зноў выплыў Верчын твар, яе вочы, а ціхі, грудны голас так і стаяў у вушах: «Васілько!..»

«Упершыню гэтак... тым далёкім летам... ля вогнішча...» — падумаў і яшчэ больш зазлаваў на сябе.— «Дурны быў, што не сказаў ёй прама...»

Тады, захапіўшы ў човен свае рыбацкія прычындалы, ён спусціўся па Быстрыцы ажно за тую затоку, дзе некалі тапілася Верка, мінуў яшчэ некалькі паваротаў і толькі потым прычаліў да сухога берага. Самавітыя дубы стаялі спакойна, упэўнена абхапіўшы дол карэннем, і ціха шамацелі лісцем.

Затрымаўся на тым месцы даўжэй звычайнага. Сцямнела ўжо, а дадому не хацелася. Ціха патрэсквала маленькае вогнішча. Яго трапяткое полымя адбівалася ў вадзе, і Васілю здавалася, што там, у царстве паласатых акунёў, нехта распальвае горан. Толькі не можа ніяк саўладаць, распаліць...

Васіль падкінуў сухога ламачча.

— Авой! — здзівілася начніца.— Авой!..

«Якая дурная птушка!» — Васіль змалку яе недалюбліваў. Але не падняўся, каб сагнаць са старога дуба, а сядзеў, абхапіўшы рукамі калені, і ўслухоўваўся ў начныя шорахі.

Трэснула галінка. Падумаў, што гэта Анціп ідзе за ўловам, і ўзрадаваўся: весялей будзе! А калі зусім ужо блізка пачуў: «Добры вечар, Васілько!» — ажно спалохаўся. — «Верка!» — баючыся азірнуцца, здагадаўся ён.— «Чаго яна тут?..»

А яна ўжо стаяла па той бок вогнішча, у белай касынцы, у цёмным спартыўным гарнітуры

і ўсміхалася. Водбліскі кастра злёгку, нібы нясмела, крапаліся яе твару, і Верка здавалася знізу вышэй свайго росту. Ад разгубленасці не змог знайсціся, што адказаць, і толькі ўбраў галаву ў плечы, нібы чакаў удару. Не заўважаючы ягонай разгубленасці, яна сказала:

— Іду берагам і бачу: касцёр цепліцца...

Памаўчала, абышла вогнішча і прысела побач:

— Ты што? Не рады?

Замест адказу — спытаў:

— У адпачынку?

— З учарашняга дня,— спакойна адказала Верка.— Сёння прыехала... Хадзіла ў лагер... Дапамагала маці кароў падаіць...

Вуголле пачало паволі шарэць. Васіль падсгарнуў агаркі і, калі яны ўспыхнулі і добра асвяцілі Верчын твар, пасмялеў і сказаў:

— Люблю вось так... ля вогнішча...

— Шчаслівы ты, Васіль! — ні з таго ні з сяго ў роздуме прагаварыла Верка.

— Я? — здзівіўся ён і адчуў, што, нарэшце, становіцца сам сабой.— Чаму гэта?

Адказу не пачуў. Кінуў позірк на яе, заўважыў засяроджанасць на твары і хацеў паўтарыць пытанне, але Верка зноў ажывілася:

— Чаму не пісаў? Уцёк і — нібы камфора ў ваду. І не адказаў на пісьмо...

— Аб чым было пісаць?

— Пра сябе... Пра работу...

— Кавалём я — не прафесарам! — зноў, нібы адчэпнага, кінуў Васіль.

— Кавалём! Прафесарам! — Верчын голас быў рэзкі.— А ты ведаеш, можа, кавалём і лепш! Можа, у таго прафесара ўсё жыццё кошкі скрабуць на сэрцы...

Такой Верку Васіль бачыў упершыню. Здзівіўся, але спытаў, пра што падумаў:

— І ў цябе... тыя кошкі... скрабуць?

— А ты думаеш — лёгка? — гарачылася яна.— Адно калі ў камандзіроўку вырвешся... Нібы маладзееш... Дыхаеш — не надыхаешся, ходзіш — не находзішся... Зайздросціла і зайздрошчу... бабам у полі...

Васіль усміхнуўся:

— То чаму не павернеш аглобляў?

— Позна! І прафесія не вясковая. І ён — чалавек гарадскі...

Васіля нібы скаланулі апошнія словы. Але не падаў выгляду. Толькі спытаў:

— А як у вас? Па-ранейшаму?

Верка крыху павагалася і толькі тады, ужо спакойна, адказала:

— Бяда з ім, Васілько!

Яму хацелася сказаць нешта такое, каб супакоіць, падбадзёрыць, але словы тыя не знаходзіліся.

Яна сядзела ўся ў трапяткім святле. Пасма коратка падстрыжаных валасоў выбілася з-пад касынкі і легла на высокі лоб. Раз-пораз у вачах успыхвалі іскаркі, маленькія і недарэчна вясёлыя. «Ад кастра»,— здагадаўся Васіль. Да яго слыху, нібы здаля, далятаў Верчын голас:

— Сіл нестае, Васілько...

Недзе над Баравой у начным небе ўспыхнула бліскавіца. Трывожна зашамацелі дубы. Ад вады пацягнула халадком. Верка паднялася і першай накіравалася да лодкі.

Усю дарогу не перакінуліся ніводным словам. Ён толькі з незразумелай упартасцю ўсё налягаў і налягаў на вёслы.

«Нямала ж гадоў мінула»,— падумаў Васіль, прыгадаўшы ўчарашнюю кароткую размову з Веркай.— «А, бачыш, не забыла, зноў назвала па-свойму...» Паклаў малаток, паглядзеў на тонка расплюшчаную палоску сталі і, кінуўшы яе на вярстак, скамандаваў:

— Перакур!

Анціп адарваўся ад занятку, рукавом выцер з пераносся кропелькі поту і згадзіўся:

— І сапраўды — духата!

Пайшлі пад таполю, у цянёк. Васіль прысеў, абапёрся плячыма аб халаднаваты камель і некаторы час глядзеў, як лёгкія пушынкі паціху апускаліся на дол. Потым працягнуў руку і, калі белы камячок нячутна лёг на далонь, у роздуме запытаў:

— Раней некаторыя ўцякалі з сяла... Закалочвалі аполкамі вокны — і на ўсе чатыры. Я іх яшчэ магу зразумець... А цяпер маладыя? Ці гэта звычкаю стала?..

Анціп нібы не чуў Васілёвых слоў — глядзеў, як дарогаю бег, смешна задраўшы ззаду плугі, трактар і абураўся:

— Так і даездзіцца можна!..

Потым у роздуме адказаў:

— Буслы перад маразамі таксама... А пацяплее — вяртаюцца...

Насупраць кузні трактар збавіў ходу, зрабіў паварот, патрэсся на няроўным пад'ёме, таргануўся ўсім сваім магутным корпусам і заглох. З кабіны вытыркнулася кудлатая галава:

— Пятровіч! Болт патрэбен!

Трактарыст молада саскочыў на дол, прыняў на рукі такое ж, як сам, кучаравае хлапчанё і затупаў пад таполю. Васіль адразу пазнаў Макаравага сына — Рыгора і міжволі пазайздрос-

цiў ягонай моцна збiтай постацi. А той фарсiста блiснуў устаўленым зубам i загаманiў:

— Халера! Добра, што вы тут, а то ажно на цэнтральную перцiся давялося б!..

Рыгор з Анцiпам пайшлi ў кузню, а потым корпалiся ля трактара, прыкручваючы той болт. Хлапчанё нi на крок не адыходзiла ад бацькi. Васiлю стала неяк зайздросна: «Бачыш, у гэтага i падмога расце! I такая, што не ўцячэ ў горад...»

А ты чым пахвалiшся? Пражыў бабылём да такiх гадоў, а нават iнстытут не закончыў. Топчашся на адным курсе. Ужо не раз браў акадэмiчныя. Даводзiў розныя прычыны — i слушныя, i так сабе. Дзякуй, што там iдуць яшчэ на паблажку. А то б — паперлi!.. I не ажанiўся... А хiба не было дзевак па душы? Табе ж падабалася Марына, што прыехала ў Заполле фермай загадваць? Нават праводзiў аднойчы пасля сходу. А чаму не прапанаваў? З-пад рукi ўпусцiў! I забраў не хто iншы, як гэты Рыгор... А Верка? Пасля таго, як прыходзiла да цябе ў дуброву, прыслала ж пiсьмо? Прыслала. I сказала, што, нарэшце, кiнула свайго Бiмбуса, паехала ў другi горад, адрас дала. А ты? Самалюбства заела?.. Скажаш, была нецiкавай для цябе? Маўляў, разам раслi, на вачах адзiн у аднаго гадавалiся... З другой цiкавей будзе! Так ты думаў? А, бачыш, нават цяпер супакоiцца не можаш. Прыйшла — i растрывожыла... Ты проста дурны чалавек, Васiль. Гэтак у «мiкалаеўскiх кавалерах» i праходзiш. А калi ж пачуў пра «мiкалаеўскага»? Летась цi пазалетась? Iшлi з Анцiпам нядзельным вечарам з ракi, а ўслед дзяўчаткi з лавачкi зашыкалi: «Цiха, мiкалаеўскiя кавалеры шыбуюць!» Тады ў цябе зашчымела ў сэр-

цы... І што з таго, калі заробак у цябе добры, і адзежыну займеў сучасную — модную, і мэблю добротную — не халасцяцкую? Адным словам — бабыль! Толькі са сваім універсальным фільтрам і пэцкаешся па вечарах... Вынаходнік! Ці ты разумнейшы за тых канструктараў? Толькі зводзіш дарэмна час. І сёння, пэўна, будзеш корпацца ў сваіх чарцяжах, інжынер недапечаны! А ты б кінуў тыя фільтры, плюнуў на іх і пайшоў бы да цёткі Палашкі. Захапіў бы пляшку, пастукаў бы ў дзверы і сказаў бы: «Прымай госця, Вера Захараўна!..» Толькі не зможаш, не скажаш... Дурны ты, Васіль, як бот ялавы...

— Чаго насупіўся, як мыш на крупы? — пачуў Васіль амаль над самым вухам зычны Рыгораў голас і ажно схамянуўся: «Во, чарцяка, крычыць, нібы я глухі!»

А той ужо прымошчваўся побач і пытаўся:

— Усё стукаеш, Пятровіч? То ў кузні, то ў майстэрні! Не надакучыла? Я на тваім месцы даўно ў начальніках хадзіў бы!

Васіль непрыязна паглядзеў і адказаў:

— У начальстве няхай другія ходзяць!

— То і ходзяць! — ужо разважліва, нібы спачуваючы, гаварыў Рыгор.— Макарэвіч не адмовіўся...

— Я — не Макарэвіч,— памяркоўна адказаў Васіль, прыгадаўшы колішнюю гаворку ў райкоме, калі прапаноўвалі яму перайсці ў суседні калгас на пасаду галоўнага механіка.— Аднойчы паспрабаваў з'ехаць. Хопіць!..

— Прыраўняў! — зарагатаў Рыгор. — Час быў не той! Тады ўсе хадзілі, як тыя коні спутаныя,—і рады былі трушком, а путы не пускалі...

— Ды кінь ты зубаскаліць!

Рыгор не пакрыўдзіўся, але перайшоў на іншае:

— А чуў навіну? Палашчына Верка прыехала! Гавораць, назаўсёды... завучам у школу...

Ад гэтых слоў Васіля скаланула, і ён не вытрымаў:

— Ідзі ты... абедаць лепш...

— З табою і пабалакаць нельга...

Рыгор змоўк. Нейкі час сядзеў нерухома, потым паклікаў сваё хлапчанё, што бавілася ў пяску, падняў на рукі, панёс да трактара і пасадзіў на сядзенне... Калі схлынуў рокат матора і стала зусім ціха, Анціп зноў у роздуме прагаварыў:

— Шалапуцісты хлопец, але работнік — харошы! І сынок яго...

Васіль слухаў і не слухаў, заняты сваім. «Няўжо адважылася? — думалася пра Верку.— Не можа быць!..»

Уздымаючы за сабою воблака пылу, прайшла дарогаю машына, поўная жанок. Яны былі ў каляровых касынках, і здавалася адсюль, зверху, што павезлі ў кузаве кветкі. Потым сцяжынкаю ў іхні канец Заполля праехала на веласіпедзе паштарка — Памфамірава Зося. Праз якую хвіліну пракруцілі яшчэ некалькі хлопцаў — Васіль іх не пазнаў,— і на дарозе стала бязлюдна. «На абед спяшаюцца!» — здагадаўся ён і нечакана прапанаваў:

— Хадзем у сталоўку?

Анціп запярэчыў:

— Дома папалудную. І парасяці падкінуць трэба... А ты — схадзі...

Васіль хацеў прычыніць кузню, але раздумаў і пачаў спускацца ўніз, да дарогі.

Каб трапіць з кузні ў сталоўку, трэба прайсці ўсё Зарэчча або, не даходзячы першых хат, звярнуць на сцяжынку і напрасткі ісці ажно туды, да бальшака. Там, ля самай шашы, крыху воддаль сяла, і стаіць тая сталоўка. Паблізу прасторнай будыніны туліцца, нібы запалкавы карабок, аўтобусны прыпынак.

Васіль пайшоў не вуліцай, а звярнуў направа, на сцежку. Пад нагамі адчувалася добра ўтаптаная, пругкая зямля, ісці было лёгка. Сцежка перасякала нечыя соткі, выбягала на бурачны палетак і па ім праставала ажно туды, да аўтобуснай, як страла. Ён глядзеў на роўныя радкі пасеваў, што зялёнымі шнуркамі цягнуліся па абодва бакі сцежкі, і разважаў: «А сапраўды, гачкі патрэбныя! Без бабскіх рук тут не абысціся. Вунь як высыпала сурэпка ў радках! Трактарам не дастанеш яе...» Потым падумалася пра Анціпа, пра таго парсюка. Васіль быў заўсёды супраць усялякай жыўнасці — адзін клопат з ёю. Але Анціп, кіруючыся сваімі меркаваннямі, кожную вясну ўгаворваў яго, і яны зноў куплялі парася. «Перакідаецца!» — гаварыў Анціп у такія дні. І яно «перакідалася». Да восені такі вяпрук вырастаў, што не верылася. Праўда, сала заўсёды здавалі ў сталоўку, а сабе пакідалі толькі мяса. Усё лета на гарышчы віселі вэнджаныя кумпякі...

Успомніўшы пра той кумпяк, Васіль раптам адчуў, як пахне ўвараная на ім капуста, і пашкадаваў, што ідзе ў сталоўку, аднак тут жа махнуў рукой: «Няхай сёння Мальвіна пакорміць!»

Ля самай сталоўкі пад навіссю вярбы ля матацыкла сядзеў Макар з сакратаром партбюро — Андрэем Калінай.

— На лаўца і звер бяжыць! — усміхнуўся брыгадзір.

Васіль падышоў, прывітаўся з Калінай за руку.

— Вось мы тут мазгуем над адным пытаннем,— пачаў Андрэй.— Трэба нашым абнавіць помнік... Каб з вечным агнём...

Моўчкі ўзяў з Андрэевых рук паперку, на якой алоўкам нехта зрабіў накід праекта новага помніка, і спытаў:

— Пры чым тут я?

— Каркас металічны трэба. Гэта — па тваёй лініі. Паглядзі, дзе што зварыць, з чаго... Увогуле, падумай, Васіль...

— Мы гаварылі пра гэта са старшынёй,— дадаў да Калінавых слоў Макар.— Сышліся на табе. Толькі ты можаш дапамагчы...

— Падумаю! — неахвотна згадзіўся Васіль і падумаў: «На пабягушках я, ці што? Гачак яшчэ не зрабіў, а тут...»

— Памазгуй, Васіль, не сярдуй! — пачуў ён Макараву просьбу і сумеўся, засаромеўся сваіх думак. Сказаў, звяртаючыся чамусьці, да парторга:

— Добра. Падумаю...

...Людзей у сталоўцы было не дужа. Акінуў позіркам сталы, спадзеючыся сустрэць знаёмых, але людзі былі не тутэйшыя, пэўна, заезджыя. Прайшоў у бакоўку, дзе вісеў алюмініевы рукамыйнік, доўга шараваў рукі і змываў з іх мыльную пену. «Не сярдуй! — прыгадаў Макаравы словы.— Дзівак! За што? Помнік той, можа, даўно трэ было перайначыць, зрабіць па-людску. А ён — не сярдуй!» Выцерся вафельным ручніком:

— Мальвіна-Маліна! Чым карміць бу-

дзеш? — з напускной бадзёрасцю запытаў ён.— Выпішы. На свой густ!

Мальвіна, падаючы квіткі, хітравата прыжмурыла чорныя, як вуголле, вочы:

— Мо і піва?

— Не! Работа! — адмовіўся і падаўся да раздатачнай.

Заняў столік, што ў самым кутку. Не спытаўшы дазволу, да Васіля падсеў, пакінуўшы сваіх, бялявы хлопец, паставіў недапіты куфаль і звярнуўся, як да знаёмага:

— Бачу, ты свойскі хлопец! Скажы, нашто такое начальства трымаюць?

— Якое? — не зразумеў Васіль.

— Нашынскае! Мы — меліяратары. І я, і вось Ваня, і Сцёпа — махнуў субяседнік у кірунку бліжэйшага століка.— З раніцы загараем!

— Чаго? — Васілю не хацелася ўступаць у размову і гаварыў толькі, як адчэпнага.

— Яшчэ ўчора пазванілі,— бедаваў бялявы.— Далажылі, што паляцела каробка... Поўдзень, а лятучкі няма...

— Прыедзе! — паспрабаваў суцешыць Васіль.

— Іваноўскі? — запярэчыў бялявы. — Мы свайго інжынера ведаем! На рыбалцы, нябось, прападае...

— А мне чаго скардзішся?

— Бо душа баліць! — стаяў на сваім меліяратар.— А яго як толькі не перастаўлялі! З саўгаса — у калгас, з калгаса — у РТС, з РТС — у ПМК... Паганая звычка ў нас: аднойчы ўхопіцца каторы за партфель, то з тым партфелем і перастаўляюць яго з месца на месца. Пакрыўдзіць баяцца!.. А каб па аддачы ставіць — дык не!..

— Паставяць! — падбадзёрыў хлопца Васіль.

— І я кажу!..

Бялявы адышоў, пэўна, задаволены размовай, і зноў прыстроіўся да сваіх. Да Васіля даляталі абрыўкі ні то п'янаватай, ні то цвярозай гамонкі пра таго Іваноўскага, і ён спачуваў і не спачуваў хлопцам. «Чаго ж тады вы тут сядзіцё? Душа баліць? А хто вінаваты?.. І хто вінаваты, што і ў мяне іншы раз душа зашчыміць?»

Быў і ў яго свой Іваноўскі — Макарэвіч, загадчык майстэрні. Любіў лынды біць. І ўсё прыставаў да Васіля, у дружбакі навязваўся. Не раз нават прапаноўваў даць сваю рэкамендацыю. А Васіль не вытрымаў і сказаў: «Не хачу твае рэкамендацыі!» Не давядзі бог, як тады пакрыўдзіўся Макарэвіч! А нешта праз месяц і паехаў ад іх. У другі калгас. На пасаду, якую некалі прапаноўвалі Васілю...

Было ўжо зірнуў на Мальвіну, але тут жа перадумаў. Больш таго — спалохаўся, што зноў можа стацца з ім такое, як тады, калі атрымаў ад Веркі пісьмо з новым адрасам. Тады таксама пацёгся ў сталоўку. Пачаў з чаркі. Заседзеўся. І сп'янеў... Мальвіна праводзіла яго дадому. Позняй ноччу... А потым не мог у вочы глянуць. Ад сораму.

У сталоўку забеглі дзяўчаты, відаць, з аўтобуса, стоўпіліся ля буфета, загаманілі. Потым зайшоў не стары яшчэ мужчына ў саламяным капелюшы і крыкнуў Мальвіне:

— Дзесяць піва!

Васіль падумаў, што заказвае на ўвесь гурт, і ў думках пахваліў чалавека. Але той, стоячы ля буфета, пачаў адзін за адным апаражняць куфлі з пітвом. «Лье, як у цабэрак!» — здзівіў-

ся такой прагнасці Васіль. На пятым ці шостым куфлі мужчына зрабіў перадышку і сказаў Мальвіне, быццам апраўдваўся:

— Шахцёрская звычка! У спякоту адным півам і жыву... У нас, у Данбасе...

«Не, трэба ісці!» — канчаткова вырашыў Васіль, падняўся і ступіў да выхада...

Зачынілі кузню, калі чырвонае сонца абляшчыла праменнямі невялікае акенца, пазалаціла ў ім цьмяную шыбіну і кінула на вярстак крыж ценю ад жалезных кратаў. Анціп стомлена ступаў наперадзе, крыху хістаючыся ў бакі, нібы ён дагэтуль справу меў не з рашпілем, а з пудовымі мяхамі. Васіль глядзеў на сутулую постаць і думаў: «Пэўна, гады бяруць сваё. Нават такі зусім просты занятак чалавеку даецца не лёгка».

Анціп мог сядзець і дома — пенсіі і прысядзібнага ўчастка хапіла б на пражытак, а калі ўлічыць і Васілёў заробак, то і зусім нечага яму турбавацца. Аднак — не. Раніцой зноў схопіцца, накорміць сваё свінчо, прыгатуе на дваіх сняданак і, калі Васіль ідзе ў кузню, абавязкова падасца з ім. І будзе, як сёння, цалюткі дзень пасабляць, дагаджаць Васілю. Не раз хацелася сказаць пра тое, але баяўся пакрыўдзіць. А сёння нечакана спытаў:

— Стаміўся?

— Што ты! — запярэчыў Анціп і спыніўся, чакаючы, пакуль Васіль параўняецца з ім.

З вёскі якраз выходзіў статак, і яны, каб не замінаць яму, збочылі з дарогі. Стаялі, слухаючы, як недзе ля крайняй хаты галёкаў пастух, наводзячы парадак у сваім «войску». Пахла сырадоем і цёплым дарожным пылам. Анціп пагля-

даў на кароў, і ў яго прыжмураных вачах Васіль заўважыў ледзь прыкметную тугу. «Успамінае ці мо параўноўвае...» З імі прывітаўся маладжавы яшчэ пастух.

— З сервітуту? — па-свойму запытаў Анціп, маючы на ўвазе лясныя выпасы.

— З канюшынішча! — крыкнуў той, перасільваючы траскатню транзістара, што, як партупея, вузкім раменьчыкам перакрыжоўваў на грудзях зялёную гімнасцёрку.

Счакаўшы, пакуль уляжацца пыл, рушылі далей. Вуліца была бязлюднай — бабы займаліся хатнімі справамі, а мужчыны, пэўна, яшчэ не вярнуліся дамоў. Ля магазіна Анціп спахапіўся:

— Цукру ж няма! Трэба забегчы!

Завярнулі ў доўгі, нібы калідор, падворак Тодара Цярэшкі, у другой палавіне хаты якога і быў магазін, прайшлі пад навіслымі галінамі сліў-вадзянак і апынуліся на ладнай пляцоўцы. Ля дзічкі, што расла пасярод двара, сядзела на траве трое мужчын — сам Тодар Цярэшка, Рыгор-трактарыст і той бялявы, што скардзіўся ў сталоўцы на сваё начальства. Васіль было не звярнуў на іх увагі і хацеў падацца прамым ходам у магазін, але гаспадар гукнуў:

— Хадзі сюды, Пятровіч!

Толькі цяпер заўважыў Васіль у цэнтры круга гліняную місу, поўную свежага мёду. Лыжкі, хлеб і вялікі бляшаны кубак з вадою былі побач.

Васіль ведаў Тодараву слабінку і не здзівіўся ўсяму гэтаму.

— Садзіся! Чаго ты! — пасунуўся Тодар па траве, выслабаняючы Васілю месца, і звярнуўся да бялявага.— Было гэта, братка, у сорак трэцім... Мы тады з Пятром — Васілёвым баць-

кам — асадніка нашага, Казю, прыпуталі. Вярнуўся, падла, аднекуль і гарнізонам у Малінаўцы камандаваў...

Цярэшка паглядзеў на місу і, нібы цяпер толькі ўспомніўшы яе прызначэнне, сказаў:

— Ды ешце вы, частуйцеся! Мо не куплены...

— Нешта з тыдзень мы ганяліся за ім.— Тодар падаў Васілю лыжку.— Усё ж прыпуталі. Жыўцом узялі!.. А ты чаго не ясі, Пятровіч?!. Узялі, значыць, таго Казю. Ну, камандзір і гаворыць: калі вы сцапалі, то і ў расход вам пускаць... Пятро выкруціўся — паслалі на нейкае заданне. А мне ажно не па сабе стала. Каб у баі! А тут?..

Тодар паглядзеў на хлопцаў і ўздыхнуў:

— Загад ёсць загад! Вяду, а ў самога... Лаю і сябе, і Казю — на чым свет стаіць... А той паварочваецца і кажа: «Будзь чалавекам, Тодар! Развяжы! Да ветру...»

Цярэшка з супольнай пачкі дастаў цыгарку, прыкурыў і падняўся:

— Прынясу радзейшага!

Прыпадаючы на перабітую нагу, Тодар закалдыбаў у каморку. З магазіна выйшаў Анціп і, не спыняючыся, гукнуў Васілю:

— То я пайду!

Васіль хацеў падняцца, але падумаў, што могуць пакрыўдзіцца на яго, і застаўся сядзець. Праз хвіліну з'явіўся гаспадар і, ставячы новы пачастунак, спытаў:

— На чым гэта я? Ага! Значыць, развязаў... А ён — і не згледзеў я — бац мне паміж ног! А братка!.. Ускіпеў я, згледзеў, дзе варушацца кусты, і — як секану!..

— Добра, што аўтамат не адказаў,— зусім

спакойна прагаварыў бялявы, аблізваючы лыжку.

Васіль убачыў, як у Тодаравай руцэ ледзь прыкметна ўздрыгвала цыгарэта, і падумаў: «Колькі гадоў мінула, а не можа супакоіцца...» А той абвёў позіркам прысутных і ціха сказаў:

— Каб не бачыць нам такога, што давялося...

Разыходзіліся, калі добра ўжо змерклася. Бялявы хлопец адразу ж за весніцамі сеў на веласіпед і паехаў сваёй дарогай. Рыгор з Васілём пайшлі дадому. Трактарыст быў зноў гаваркім, як тады, ля кузні, і не сунімаўся ўсю дарогу. Ля свае хаты спыніўся і пахваліў бялявага:

— Свойскі хлопец!

— А чаго ён з табой? — спытаў Васіль.

— Ат! — пасур'ёзнеў Рыгор.— Каробку ладзілі...

Памаўчалі. Потым Васіль, успомніўшы пра сваё, пацікавіўся:

— Ці фільтр мой паставіў?

— Паставіў, Пятровіч! — весела адказаў той, зусім не звяртаючы ўвагі на Васілёву заклапочанасць.

— І як?

— Халера яго ведае!.. Пакуль робіць!

— Мо і будзе рабіць?

— Павінен, Пятровіч.

— Трэба пачакаць...

— Пачакаем!.. Ну, то я пабягу да свае Марыны! — раптам працягнуў хлопец руку і знік за брамкаю.

Васілю спяшыць не было куды. Дома чакаў яго хіба Анціп, час ад часу пераключаючы тэле-

візар з адной праграмы на другую. Ён гэтак рабіў амаль кожны вечар, шукаючы чаго весялейшага. А раней, калі толькі набылі яны той «Аганёк», крукам сядзеў ля яго, ажно пакуль не канчаліся перадачы.

— Цікава ж! — нібы апраўдваўся перад Васілём і потым пераказваў-каменціраваў убачанае.

Васіль разумеў Анціпа, тую яго амаль дзіцячую цікаўнасць да ўсяго, што рабілася на свеце, бо чалавеку далей Заполля, можна сказаць, і не давялося пабыць за ўсё жыццё. Дзіцячыя гады прайшлі ў сіроцтве — бацькі рана памерлі ад сухотаў, а маладосць праляцела, нібы агорнутая туманам. Анціп ніколі не ўспамінае пра яе — пэўна, і не захавала памяць тыя гады, ці, можа, саромеецца і не хоча заводзіць нават гаворкі пра тое. Васіль так і не ведае толкам, а спытацца — не паварочваецца язык...

На лавачцы ў святле вулічнага ліхтара сядзеў Памфамір і клікаў яго. Васіль нехаця спыніўся і прывітаўся:

— Добры вечар, айцец Памфамір!

І тут жа асекся:

— Даруйце, па старой звычцы назваў.

— А нічога! — адказаў той.— Усе так велічаюць... каторыя старэйшыя... Хаця, які я ўжо айцец? Царква колькі гадоў...

Памфамір паляпаў па кішэні, шукаючы запалкі, і, не пачуўшы званага шоргату, папрасіў агню. Васіль даў прыкурыць і прысеў побач. Той зацягнуўся, закашляўся і, калі сцішылася ў грудзях, са шкадаваннем сказаў:

— Калісь быў і айцом... А цяпер — матылі-цы апанавалі... Усё — бухі ды бухі...

Выгляд у Памфаміра быў, сапраўды, неважнецкі. Ён нагадваў чалавека, які ўсё сіліўся ўспомніць нешта, але зрабіць гэта ніяк не мог і ад таго толькі мучыўся.

Да брамкі падышла Сынклета — дзябёлая і не ў меру гаваркая баба — Памфамірава жонка, паглядзела праз высокія штыкеціны і, убачыўшы Васіля, узрадавалася:

— Балакаеце? То і я з вамі пасяджу!..

Рыпнулі завесы, брамка адчынілася і выпусціла матушку на вуліцу. Сынклета бесцырымонна ўмасцілася побач з Васілём і, не звяртаючы ўвагі на свайго мужа, загаманіла:

— От жа добра пасядзець увечары! Так і ўспамінаеш маладыя гады! Так і ўспамінаеш...

Васіль падумаў: зараз пачнецца! Будзе расказваць вядомую ўсяму сялу гісторыю, як у яе некалі закахаўся малады поп, абвянчаў на сабе і прывёз ажно з-пад Целяхан сюды, у Заполле...

Але матушку сёння турбавала іншае. Яна стукнула рукою ў Васілёва плячо і працягвала:

— Была гэта я ў горадзе. Свайму меншаму перадачу вазіла: яец сабрала, масла збіла, пеўня таго, што вечна да людзей чапляўся, засмажыла... Экзамены ў яго пачынаюцца, дык, думаю, няхай сабе сілкуецца, не гойсае па тых сталоўках, не зводзіць часу дарэмна. Да таго ж, як ні кажы, хатні наедак спарнейшы...

Васіль не слухаў, і яна, каб прымусіць яго, зноў злёгку стукнула ў плячо. «Вот звычка дурная!» — ледзь стрымаўся ён.— «Трэба ісці...» А Сынклета хвалілася:

— Прыехала, значыць, у горад, убілася ў аўтобус. Духата! Аж млосна робіцца! А тут яшчэ натоўп як шугане ў мой бок! Заціснулі ў кутку — не дыхнуць, не войкнуць... Стаю і толь-

кі за адно дзякую бога: не пакрыўдзіў ростам. А то — зацерлі б!

Васіль усміхнуўся такой шчырасці, але прамаўчаў.

— Думаю я гэтак аб сваім лёсе, як раптам чую: нехта пад пахаю ў мяне корпаецца. Глянула: дзяўчо! І шкада стала. Уперлася свабоднаю рукою ў столь, адціснула плячыма тых мужыкоў, што насядалі ззаду, і кажу:

— Вылазь, дачушка!

Выслабанілася яна. Стаімо. Маўчымо. Гляджу я на яе зверху і вачам сваім не веру: няўжо могуць такія пругкія косы быць? Як медная драціна...

— О! Гэта то гэта! — не стрываў Памфамір.

— Памаўчы! — цыкнула матушка і зноў за сваё:— З тое цікавосці хацела спытаць пра гэта, але маё дзяўчо падняло галаву — і сэрца ў мяне ажно зайшлося: бедная! З такімі падковамі пад вачыма!.. Думаю: за што ж гэта цябе адчыхвосцілі так? За якія грахі?.. А прыгледзелася лепш — і паспакайнела: гэта ж сінім алавіком яна сябе так размалявала!

«Нібы Мальвіна!» — мільганула ў Васіля думка, і ён злавіў сябе на тым, што цікавіцца балбатнёй матушкі. А тая не сунімалася:

— Гляджу гэта я і гадаю: нашто ты гэтак? Не саромеючыся. У такіх гадах... Жыццё можа так абярнуцца, да такога чалавека можаш трапіць, што тыя падковы без алавіка паселяцца пад вачыма...

Памфамір хацеў нешта ўставіць сваё, ды матушка зноў не дала нават і заікнуцца:

— Але ці я дурная, думаю, каб гаварыць такое незнаёмаму чалавеку? Калі паслабаднела крыху ў аўтобусе, перавяла дух і спытала толь-

кі пра тыя косы. Век пражыла, кажу, а такіх не бачыла! А яна — ачуняла, смяецца: гэта, кажа, шыён, а не косы. Шыён? — пытаюся. Які гэта такі шыён? Шыён, кажа дзяўчо. Цяпер гэта модна... З конскай грывы...

— Эт! — зноў памкнуўся нешта сказаць Памфамір, але закашляўся і перадумаў. А Сынклета стукнула яшчэ раз Васіля па плячу і ажно ўзмалілася:

— Усю дарогу сядзела, як на кастрыцы! А божачкі, думала, каб гэта са старога чалавека надзекі рабілі? А потым даўмелася: то ж і да нашага конюха падбіваліся гарадскія... Прыехала дадому — не вытрымала. Ідучы са станцыі, знарок завярнула на выган. Мікіта качаецца сабе ў траве, выграваецца на сонцы, а коні — самі па сабе — пасуцца. Акуратненькія. Усе, як адзін. І спераду, і ззаду... Пытаюся: «На шыёны?» «А мне — што? — смяецца Мікіта,— хоць коні сталі падобны да стаеннікаў!..»

На ганак выйшла іхняя дачка Зося і загукала ў цемру:

— Тато! Мамо! Вячэра стыне!..

— Вось я і кажу: бяда з гэтымі дзяўчатамі! Узялі ў звычку хвасты чапляць! — падбіла «бабкі» матушка і паднялася, ужо не звяртаючы ўвагі на Васіля. За ёю, бухікаючы, паслушна затупаў айцец Памфамір.

Васіль дадому не пайшоў, а чамусьці накіраваўся назад. Непрыемна было ад Сынклетавай балбатні, але падумаў, што матушка ў нечым мае рацыю. Пра іхнюю Зосю рашыў: «Векаваць ёй у дзеўках». І ўсё з-за бацькоў. Раней не бралі, бо папова дачка. А цяпер — перарастак! Толькі ўсяго і карысці, што газеты развозіць...

І тут жа засаромеўся такіх думак. «А хіба Мальвіна лепшая? — паставіў чамусьці Зосю побач з буфетчыцай.— Толькі тая, канечне, людзей не цураецца...» Падумалася і пра Верку: «Няўжо адважылася? Няўжо Рыгор праўду сказаў?.. Пацяплее — вяртаюцца...» — успомніў Анціпавы словы і паскорыў хаду. Мінуў кузню, прайшоў добрую палавіну правага канца вёскі і раптам спыніўся. На фоне лёгкіх аблакоў перад ім паблісквaў цагляным бокам помнік. Васіль патаптаўся, прыкінуў у думках, як будзе выглядаць, калі перaробяць яго, і пакрочыў былым сваім падворкам. Потым мінуў старое Верчына гумнішча і не згледзеў, як апынуўся на пагорку, дзе некалі як з-пад зямлі вырас перад імі Анціпка. Пастаяў хвіліну і стомлена апусціўся на цёплую зямлю.

Унізе ляжала соннае сяло.

У начным небе не сунімаліся вёрткія кажаны. Чутно было, як у Палашчыным хляве пастукала рогам аб сцяну карова, уздыхнула і зноў сцішылася — задрамала. Недзе з-за Быстрыцы, з тарфянікаў, даляцеў прыглушаны адлегласцю рокат матора...

НАД КЛЁНАМІ — ЧЫСТАЕ НЕБА

I.

Усё пачалося з першынца — Максіма. Нарадзіўся ён, і бацька з радасці і гордасці за сябе прынёс з панскага лесу і пасадзіў пад акном невялічкае дрэўца.

Гэта ж ён зрабіў і тады, калі з'явіўся на свет Міколка. Трэці клён пасяліўся ў нашым гародчыку, калі нарадзіўся я. Казала маці, што прынёс яго бацька не адзін, а з «надзейнымі» памочнікамі — Міколкам і Максімам.

— Божачка! — расказвала яна.— Я яшчэ слабая была, а яны пацягліся ў лес і прынеслі тое дрэўца...

II

Нялёгка жылося нашай сям'і. Я гэта зразумеў тады, калі мой клён прыкметна шугануў угору і набыў не густую, але кучаравую шапку. У нас вечна не ставала хлеба. Яго мы елі толькі да каляд, ды і то з мякінаю напалавіну. І, каб пракарміць сям'ю, бацьку даводзілася кожную зіму падавацца на тралёўку панскага лесу.

Яшчэ прыцемкам маці збірала яго ў дарогу. У кужэльную торбачку клаўся бульбяны камяк,

некалькі скрылікаў сала, стосік грачаных бліноў, спечаных у галанцы на пажоўклым здоры.

Глядзелі мы на гэтыя зборы, і нам рабілася зайздросна, што бацька ўволю паесць такой смакаты. А ён, нібы прачытаўшы нашы думкі, заўсёды перад ад'ездам даставаў з торбы блінец і торкаў яго ў маю руку. Я разрываў блінец на тры часткі і дзяліўся з братамі.

Святам для нас была субота, калі бацьку выплачвалі заробленыя за тыдзень грошы і ён, завярнуўшы з тракту да шынкаркі Евы, купляў там селядца і бохан сітнага хлеба.

Маці разразала гасцінец, ставіла на стол чыгунок сопкай бульбы, і мы вячэралі.

III

У тую зіму Максім упершыню падаўся разам з бацькам на тралёўку. Маці выпраўляла яго, як дарослага. Падала самаробную торбачку з наедкам і сказала:

— Ну, з богам, сынок!..

Мы праводзілі Максіма і бацьку за веснічкі і стаялі, пакуль сані не згубіліся ў далечыні. Ціснуў мароз. Клёны нашы стаялі маўклівыя, пасівелыя ад калючага інею.

Мы чакалі, што на грамніцы прыедуць нашы, прывязуць селядцоў і сітнага хлеба. Але раніцою прыбегла суседка і загаласіла:

— І майго, і твайго чалавека, і Максімку... дзеравінаю!..

Маці, як стаяла ля печы, так і скамянела.

Не выціснула яна ні слова і тады, калі прывезлі ў санях нябожчыкаў. Не плакала і назаўтра, калі праводзілі іх у канец вёскі, на могілкі. Толькі пасля, вярнуўшыся дадому, падышла да

самага высокага клёніка, абхапіла яго аберуч і залілася горкімі слязьмі:

— А божачка! А што ж гэта будзе?!

IV

Маці не змагла ні перажыць, ні забыцца на сваё гора. Яна сцішылася, замкнулася ў сабе, счарнела і моўчкі перабівалася з намі ўсю тую зіму.

А калі з поўдня пацягнула цёплым ветрыкам, сказала Міколку:

— Я цябе ў парабкі ўладкавала. Да солтыса. Усё ж які злот у хату будзе...

І Міколка пайшоў. Ён і жыў, і працаваў у другім канцы вёскі, але дадому наведваўся зрэдку.

Маці радавалася кожнаму яго прыходу. А калі за Міколкам зачыняліся дзверы, зноў рабілася маўклівай і строгай.

Аднойчы яна праплакала ўсю ноч. Я бачыў, як яна стаяла перад абразамі на каленях...

V

Тую восень ніхто не забудзе ў нашай вёсцы. Тая восень была для нас найвялікшай вясной.

Мы ўсім сялом сыпанулі на выган і чакалі іх. А яны ішлі, поўніўшы наваколле рокатам і громам.

Параўняўшыся з натоўпам, танкі спыніліся. І байцы ў зялёных пілотках сышлі на зямлю.

Палеская вёсачка палыхала чырвонымі сцягамі. Барвовы колер быў усюды: на хатах, на шапках дзядзькоў, у косах дзяўчат. Нават нашы аднагодкі-клёны, здавалася, памаладзелі ў той дзень. Іх кучаравыя шапкі гарэлі зіхатлівай, нязвыклай чырванню...

VI

Непрыкметна праляцела зіма. Прагрэтая сонцам зямля неўзабаве пад плотам вытыркнула рэдкую траву, а ў зарэчных лугах жоўтым полымем загарэлася весялуха-лотаць. Прыляцелі нашы буслы, клапатліва клекаталі над хатаю...

А потым на зямлю сышоў чэрвень...

Аднойчы мы з Міколкам сядзелі на лавачцы пад сваімі клёнамі і пачулі знаёмы голас:

— Как жызнь, пацаны?

У вузкім пралёце веснічак стаяў Сашка-баец. Ён ужо два гады не-не ды і заходзіў да нас, калі бываў у звальненні. Прыносіў пачытаць невялічкія кніжачкі пра герояў фінскай вайны, да позняга вечара расказваў пра сваю далёкую падмаскоўную вёску. І мы ўдзячны былі яму за гэта.

А цяпер ён сказаў:

— Вось кніга, як гартавацць сталь. Пачытайце. Вельмі цікава...

Маці, як звычайна, вынесла конаўку малака:

— Выпі, сынок, халодненькага...

Сашка асушыў тую конаўку, падзякаваў, сказаў, што ў наступную нядзелю зойдзе па кніжку і развітаўся...

Ён пайшоў, а маці ўздыхнула:

— Якраз Максімка такім быў бы...

VII

Мы ляжым на ўзмежку і слухаем, як Міколка чытае кніжку пра Карчагіна. Мае сябрукі прыціхлі, стаіліся і, здаецца, не дыхаюць.

Міколка не зважае на іх і ўсё чытае. Ён спя-

шаецца — сёння павінен забегчы па кнігу Сашка-баец.

Праляцеў над нашымі галовамі чмель і ўмасціўся на валошку. Валошка захісталася і нахілілася амаль да самай зямлі. Не вытрымаў і травінаю выцяў чмяля. Ён нездаволена ўзняўся і патануў у залацістых сцяблінах жыта.

— Самалёты! — раптам крыкнуў нехта.

Сапраўды, высока ў небе, якраз над нашай вёскай, плылі адзін за другім два самалёты.

— Вучацца! Бачыш, як задні заходзіць наперарэз першаму? — сказаў Міколка.

Толькі ён гэта прагаварыў, як нешта ўгары затраскацела, і першы самалёт, выпусціўшы чорны хвост дыму, стрымгалоў паляцеў долу. Да нас дайшоў водгук далёкага выбуху.

У мяне аж зайшлося сэрца.

— Хадзем дахаты! — сказаў Міколка і падняўся.

VIII

Як страшна ўспамінаць тое!..

...Другі дзень усе жылі ў чаканні невядомага. Недзе там, на ўсходзе, грымела, нібы ў навальніцу. Гаварылі, што фашысты пабывалі ўжо ў суседніх вёсках...

Позна ноччу пастукалі ў дзверы. Маці выйшла і, чутно было, жахнулася:

— Сашка!? Адкуль жа ты?..

Пры цьмяным святле газнічкі мы сядзелі за сталом, і Сашка-баец расказваў:

— Збілі нас... у першы дзень... Я выкінуўся над самым лесам, а пілот...

Ён змоўк, выцер далоняй узмакрэлы лоб:

— Сёння на досвітку даплёўся да аэрадрома. Але не застаў сваіх...

Мы накармілі Сашку і патушылі газнічку. Да раніцы праляжалі ў трывозе. Чулі, як былы стралок скрозь сон на некага лаяўся праз усю ноч:

— Сволачы!.. Якія... сволачы...

Назаўтра і мы ўбачылі фашыстаў. Яны спакойна, нібы гаспадары, праехалі на грузавіку з аднаго канца вёскі ў другі і спыніліся насупраць нашай хаты.

— Сашка! Хавайся! — крыкнуў я.— Немцы!

— Я пакажу, дзе пагрaбок... Бяжым! — прагаварыў Міколка і кінуўся да дзвярэй. За ім — Сашка. Тут жа пачуліся кароткія аўтаматныя стрэлы. А потым усё сціхла. Праз акно было відно, як двое салдат падаліся на наша гумнішча, пастаялі і, закурыўшы цыгаркі, вярнуліся да машыны.

Яны паехалі, а мы з мамай доўга яшчэ не асмельваліся выйсці на падворак. А выйшлі — і замерлі на месцы. Ля паўразваленага старэнькага паграбка ляжаў, шырока раскінуўшы рукі, Сашка-баец. Крыху воддаль ад яго — Міколка.

IX

Мы не знаходзілі сабе месца. Калі б я не крыкнуў тады, каб хаваўся Сашка-баец, то такога і не было б. Фрыцы ў той дзень нават не зайшлі ні ў адну хату... Маці ўсе дні моўчкі корпалася ў гародчыку, не гаворачы са мной ні пра што. Пазней я пачаў заўважаць, як яна, праходзячы каля нашых клёнаў, раптам спынялася і доўга глядзела на тыя дрэўцы. Яе пасівелыя валасы выбіваліся з-пад хусткі, ападалі на вочы, закрывалі твар...

Мне рабілася боязна за яе. Выбягаў на падворак, браў яе за руку і вёў у хату.

X

Пасля той недарэчнай смерці Міколкі і Сашкі-байца прайшло больш года. Дні цягнуліся, як вечнасць. І кожны з іх прыносіў у нашу глухую вёсачку толькі адны трывогі.

Аднойчы вярнулася маці ад суседкі ў слязах:

— Кажуць, цябе ў Нямеччыну забіраюць... Я пашукала слепаты курынай. Натрыся...

Цвіком я падрапаў на нагах скуру і нацёрся зеллем. Потым да цела прыклаў тае курынай слепаты і на ноч.

Прачнуўся ад гарачыні і болю. Раскруціў анучкі — на нагах скура была чырвонай, выступілі пухіры.

— Ну і добра,— сказала маці.— Праміне, бог дасць...

Прыйшоў стараста, былы солтыс, уручыў позву і строга наказаў з'явіцца на зборны пункт.

Упэўнены, я пайшоў. Са мной было яшчэ трое, такіх, як і я, падлеткаў.

XI

Мы сядзім, прыхінуўшыся адзін да другога плячыма: што цяпер будзе? Куды нас павязуць?

Верасвёўская ноч халодная, дажджлівая. Прабірае да касцей. І не варухнуцца. Учора здорава адлупцавалі мяне гумай за тое, што хацеў адкруціцца ад набору...

Чутно, як там, за агароджай з калючага дроту, хлюпае па гразі вартавы-паліцай. Я падымаюся і нясмела іду да яго.

— Дзядзечка! Адпусці нас. Мы ж — не дарослыя!

Боты перастаюць чвякаць.

— А няўжо — дзеці? У пятнаццаць гадоў людзі ваююць...

Сказаў гэта і змоўк. Пад нагамі паліцая зноў захлюпала гразь.

XII

Не дачакаўшыся нас, на зборны пункт прыйшлі нашы маці. Але іх не пусцілі, аднак дазволілі перадаць нам такі-сякі харч. Толькі не да яды было. Не лезла ў горла анічога. Нават грачаныя аладкі, спечаныя на алеі.

Неўзабаве нас пастроілі ў калону, яшчэ раз пералічылі, перапісалі і, пагрузіўшы на машыну, павезлі на станцыю.

У апошні раз паглядзеў на маці. Згорбленая, стаяла яна на паваротку вуліцы і ражком хусткі выцірала вочы.

XIII

Амаль два гады я жыў у пастаянным страху. Толькі аб адным думалася: як выжыць?

Спачатку трапіў да баўэра, які не лічыў мяне нават за чалавека. І я, назапасіўшы сухароў, аднойчы позняй восеньскай ноччу выбраўся са свае канюшні і напрасткі, праз асірацелыя палі, падаўся на ўсход. Абыходзіў вёскі, маёнткі, фермы, баючыся трапіць каму-небудзь на вочы. А на світанні, зашыўшыся дзе-небудзь у кусты, забываўся ў палахлівым, трывожным сне.

Аднойчы мяне ўсё-такі схапілі. Схапілі, як тое зайчаня. І хто? Сапляккі, фрыцаўскія неданоскі...

Я мог чакаць усяго. Нават таго, што мяне прыстрэляць. Але ніяк не думаў, што давядзецца паспытаць горшага.

XIV

Той лагер, куды я трапіў пасля ўцёкаў, знаходзіўся непадалёку ад невялікага прускага гарадка. Акальцаваны ў некалькі радоў калючым дротам, з вежамі па вуглах, ён здаваўся мірным і ціхім паселішчам. Але гэта было не так.

Наступнай раніцай нас паднялі блокфюрэры, і мы выстраіліся на паверку. Я здзівіўся нязвыклай пакорлівасці людзей. Яны гадзінамі моўчкі прастойвалі на пранізлівым ветры, а потым ішлі па сваю порцыю «кавы».

Пасля «кавы» — работа на торфабрыкетным заводзе. Мы стаялі па калені ў чорнай вадзе і лапатамі нагружалі тачкі.

Я спытаў у свайго суседа-ўкраінца:

— Скажыце, дзядзька, з галадухі вы такія слабыя, ці што?

Ён неяк дзіўна паглядзеў на мяне і, азірнуўшыся, ціха прагаварыў:

— У дадатак яшчэ... п'юць кроў нашу...

Я ў гэтым пераканаўся на наступны дзень. Пасля «кавы» нас не пагналі на тарфянікі, а зноў выстраілі, толькі ўжо каля будынка лагернай бальніцы. Заходзілі туды вязні па аднаму. А выходзілі...

Як цяпер бачу таго «доктара» са шпрыцам у руках:

— О, гуд! О, гуд!..

...Аслабелы, мабыць, пасля вялікай страты крыві, выходжу на пляц — падаю. Потым нехта валачэ мяне па бруку і кладзе на халодную зямлю.

XV

Праз тыдзень такое паўтарылася зноў. Ляжаў на краю пляца з такімі ж, як і я, «апрацаванымі» «доктарам» вязнямі і ўспамінаў родную хату, нашу палескую вёсачку... А потым перад вачыма паўсталі баўэр, мой закутак пры яго канюшні...

Калі я ў той дзень, у наступны і ў соты дзень у тым страшным канцлагеры ў думках угаворваў маці трываць і чакаць мяне, рабіў я тое дарэмна. Яе ўжо не было тады...

Аб гэтым я даведаўся, калі вярнуўся ў родныя мясціны.

Мне расказалі жанкі, як тое здарылася. Я ўявіў, як у дождж і ў сівую замяць у сваёй нязменнай шаляноўцы, з торбачкай цераз плячо абыходзіла яна вёскі, як гаварыла, радуючыся кожнай скарынцы хлеба:

— Цяпер накармлю я сваіх сынкоў...

Я ўявіў, з якой спагадай і жалем праводзілі яе з хаты вочы жанок... Я ўявіў і старасту, які абыякава ківаў ёй услед:

— Звіхнулася баба...

І яшчэ я ўявіў той дзень, калі ў нашу вёску прыехалі карнікі. Як яны напіліся, як пайшлі адпачываць у стадолу і як яна, мама, завязаўшы дротам дзверы, падпаліла тую стадолу...

Яе павесілі. У гародчыку. Пад акном...

XVI

Я назаўтра пакінуў вёску.

Але іншы раз нешта зашчыміць сэрца, перапоўніць балючай тугой, і тады рупіць кінуць усё на свеце і паехаць у родныя мясціны. Так было

са мной і ўчора. І я, падгаварыўшы сваіх падлеткаў-сыноў, паехаў у вёску.

Ішоў са станцыі імшыстай лясной сцяжынкай пад гоман прыдарожнай лістоты...

Толькі на падворку не стрымаўся. Падышоў да нашых клёнаў, што, як памяць, стаяць ля старэнькай матчынай хаты. Падышоў да свайго...

А над клёнамі, як і ў вачах сыноў маіх, было чыстае-чыстае неба...

БУКЕТ КОЦІКАЎ

I

Прытожыя ў нашых мясцінах лясы. Хораша паблукаць па іх тады, калі толькі што пачынае абуджацца зямля. І хоць няма яшчэ таго прывычнага ляснога гоману, але адчуваеш сябе там і лягчэй і вальней.

Учора я таксама падаўся ў гай. На дварэ сакавік, а не вытрымаў — пайшоў. Доўга хадзіў леснымі сцяжынамі. Ужо было хацеў падацца дадому, як раптам пачуў ціхую песню. Гэта было так нязвыкла, што міжволі спыніўся і прыслухаўся. Мне падалося, што я недзе чуў гэты голас. І песня была пра самае светлае на зямлі...

II

Я не памыліўся. Па сцяжынцы ў мой бок, трымаючы пучок вербалозу, ішла яна. Спынілася, заўважыўшы мяне, і сумелася. Але тут жа знайшлася:

— Коцікі распусціліся... Ля рэчкі...

Яна шчакою прытулілася да залацістых галінак і засмяялася:

— Цёпленькія...

А потым схамянулася, змоўкла і пайшла, таропка, у бок вёскі.

Я чакаў, што зноў пачую песню, але дарэмна...

III

Вярнуўся дахаты і доўга дакараў сябе, што пайшоў у той гай. Сядзеў бы, думалася, у хаце, уткнуўшы нос у кніжку, і ўсё было б добра. Хутка скончыўся б адпачынак, і я паехаў бы ў горад. Ды і Наташа жыла б спакайней. Я ж бачыў, як уразіла яе наша сустрэча. Ад нечаканасці нават не прывіталася...

Ды хто я цяпер ёй? Так, аднавяскоў.

IV

Даўно гэта было. У дзесяты клас хадзілі ў суседняе сяло толькі мы з Наташаю. Нас нават пасадзілі за адну парту. Мы пасябравалі.

...Добра помню той дзень. Першыя кволыя ручаінкі струменіліся па снежных каляінах. Мы ішлі і радаваліся блізкай вясне.

— Усё ж, Наташа, я на табе... ажанюся...

Яна здзіўлена паглядзела на мяне і засмяялася:

— Дурань!

Сыпануў першы, споры і не такі яшчэ цёплы дожджык. А я стаяў і глядзеў на яе сляды, якія раставалі, сінеючы, у цаліку, і нічагусенькі не мог зразумець.

V

Аднойчы наша хімічка тлумачыла новую формулу, а я пісаў на лістку паперы: «Скончым

школу і распішамся». Наташа адказвае: «Не дуры».— «Распішамся і паедзем у горад»,— стаю я на сваім.— «Я з вёскі не з'еду»,— піша яна.— «Чаму?» — «Пасаг у мяне нялёгкі...»

Я некалькі хвілін удумваюся ў сэнс яе слоў і здагадваюся: яна гаворыць пра бацьку. Тут жа адказваю: «Будзем дапамагаць. Ды ён і не вечны...»

Прачытала мае апошнія словы і збялела. Глянула чужымі вачыма ў мой бок, разарвала лісток і адвярнулася...

VI

На выпускным вечары былі таксама чужымі. Я адчуваў, што тады пакрыўдзіў Наташу, але нічым не мог апраўдацца перад ёю.

А перад ад'ездам у інстытут пайшоў вечарам у другі канец вёскі. Гародамі даплёўся да іхняй хаты і пастукаў у дзверы.

— Чаго грыміш? Не бачыш, ці што?

Я здрыгануўся. Асіплы мужчынскі голас, здавалася, чуўся з-пад зямлі. Азірнуўся і толькі тады ўбачыў на прызбе дзядзьку Хвядоса. Яго калясачка на гумавых колах стаяла побач, паблісквоючы адшліфаваным донцам-сядзеннем. Гаспадар неяк дзіўна перакуліўся на адным месцы, правай рукой падняў гэты вазок, паставіў на прызбу і ўжо ціха сказаў:

— Прысядзь. А то на прызбе, чаго добрага, штаны вымажаш...

VII

Мы сядзелі і маўчалі, занятыя сваімі думкамі. Я час ад часу кідаў позірк на гэтага пажылога ўжо чалавека, і мне рабілася няёмка. По-

бач з ім — бязногім і скалечаным — я здаваўся асілкам, але адчуваў сваю нікчэмнасць...

Глядзеў на натруджаныя, мазолістыя рукі Хвядоса, якія спакойна ляжалі на тым месцы, дзе павінны былі быць калені, і нечакана сказаў:

— А Наташа ваша... харошая...

У адказ пачуў:

— Не ў маці пайшла...

VIII

Вечар выкаціў на канёк суседняй хаты поўню, і яна заліла трапяткім святлом надворак. Твар дзядзькі Хвядоса, перакрэслены глыбокім шрамам, здаваўся цяпер маладзейшым, быў спакойны, як у чалавека, які ўсё зрабіў на сваім вяку.

Раптам Хвядос ажывіўся:

— А тая — была...

Я ведаў пра каго ён. «Тая» — гэта жонка Хвядоса. На пяты год пасля вайны яна сышлася з прыезджым шабашнікам і, пакінуўшы мужа-калеку і падлетка-дачку, падалася немаведама куды. Аб ёй з тае пары — ні слыху. І Наташы трэба было адной, з дапамогай суседзяў, весці гаспадарку, даглядаць бацьку. І вучыцца.

— А помніш, як Наташка мяне ў школу прывалакла?

IX

Хіба такое забываецца?..

Быў школьны вечар, прысвечаны героям вайны — аднавяскоўцам. Сабраліся не толькі мы, вучні, але і нашы бацькі. Прыйшлі былыя салдаты, партызаны. Не было толькі Хвядоса.

Ці то бездараж перашкодзіла яму «прыйсці» на гэты вечар, ці то яго забыліся запрасіць — хто ведае. І вось у самы разгар гаворкі пра тыя далёкія дні расчыніліся дзверы класа, і мы ўбачылі... Наташу. Яна цягнула за сабой бацькаву каляску, сілячыся пераваліць яе цераз парог. Але не змагла. Заплакала і адвярнулася, прыпала да вушака і залілася, ужо нікога не саромеючыся, горкімі слязьмі.

Некалькі дзядзькоў усхапіліся, асцярожна паднялі Хвядоса разам з каляскай-самакатам, пранеслі праз увесь клас і паставілі на табурэтку...

...У той вечар, седзячы на прызбе, я адчуваў сябе ніякавата. Здавалася, што калі б гэта было ўдзень, а не пры бляклым святле поўні, я не вытрымаў бы і хвіліны, падняўся б і гародамі, каб не бачылі людзі, уцёк дадому. Але хацелася пагаварыць з Наташай, расказаць аб сваім рашэнні Хвядосу.

Толькі не ладзілася ў нас гаворка. Я не мог ні з таго ні з сяго сказаць яму: так і так, вось чаго я прыйшоў, дзядзька Хвядос. А ён, здавалася, зусім і не прыкмячаў мяне, рабіў адну за другой зацяжкі самасадам ды зрэдку кідаў якоенебудзь слова.

Наташы я не дачакаўся ў той вечар. Яна, пэўна, затрымалася на ферме, куды ўладкавалася пасля школы. А можа, даведаўшыся пра мой візіт, не захацела трапляць на вочы?..

X

Два гады я не быў у роднай вёсцы. У час канікулаў уладкоўваўся дзе-небудзь на часовую работу, каб зарабіць колькі рублёў на свае сту-

дэнцкія выдаткі, і жыў, можна сказаць, спакойным жыццём. А на трэці год здарылася-такі сустрэцца з Наташай...

Аўтобус тады не праходзіў праз нашу вёску. Бліжэйшы прыпынак — кіламетры са тры ад яе. Гэта калі ісці дарогай. А напрасткі — не будзе і вярсты. Вось я і пайшоў бліжэйшым шляхам. І напаткаў яе, Наташу.

Яна зжынала пырнік з узмежка і складала на невялікую посцілку. Прывітаўся, сеў на ўзмежак і закурыў. А яна, Наташа, відно было, прысаромілася, пакінула свой клопат і прысела таксама, толькі воддаль, здзіўленая такой нечаканай сустрэчай. Няёмка было маўчаць, і я, каб пачаць неяк гаворку, запытаўся пра вясковыя навіны. Хвілін колькі Наташа маўчала, а потым прагаварыла:

— Хіба не ведаеш?..

XI

Я ведаў. У той год, як я падаўся ў інстытут, прыехаў у нашу вёску Андрэй-баяніст. Вясёлы, зухаваты. Упадабаў ён маладую, прыгожую даярку і неўзабаве ажаніўся, пайшоўшы, як некалі казалі ў нас, у прымакі.

Але не склеілася ў іх жыццё. Андрэй здзекваўся з Наташы і асабліва з яе бацькі. І яна прагнала яго...

...Наташа паднялася з узмежка:

— А сына я выгадую...

XII

Мы пайшлі ў вёску. Нёс я тую посцілку з духмяным пырнікам і думаў пра Хвядоса, пра

яго дачку. Думаў і пра таго чалавека, які робіць па зямлі першыя свае крокі...

Ля веснічак спыніліся.

Недзе адтуль, з глыбіні двара, да нас даляцеў смех хлапчука і басавіты голас Хвядоса:

— Смялей, унучак, смялей...

На твары Наташы прабегла цёплая ўсмешка:

— Вучыцца хадзіць Сяргейка...

Я развітаўся. Моўчкі. Стрымана.

XIII

А ўчора зноў сустрэўся з Наташаю. Нечакана. У нашым сінім гаі. Яна ішла лясною сцяжынкаю і... спявала.

Недзе з поўдня дабіралася да нашых мясцін вясна. Наташа назбірала «коцікаў» — гэтых вясновых першынцаў — і несла іх, шчаслівая, дадому.

Яна несла іх сыну свайму.

І старому Хвядосу...

ТЫ ПАЙШЛА Ў СОНЦА

I

Па-рознаму збіраюцца людзі ў дарогу. Адны бяруць з сабой усё, што на відавоку — і патрэбнае, і непатрэбнае. Другія — толькі тое, што ім павінна аблегчыць далёкі шлях. Трэція — не бяруць нічога. Ці то з бестурботнасці і ляноты, ці проста так, па звычцы.

А я, выпраўляючыся ў дарогу, чамусьці заўсёды бяру і прыкрую горыч, і светлую радасць, і непрыглушаныя гадамі трывогі ўжо далёкага і такога яшчэ блізкага юнацтва. І нікому не скарджуся, што ноша мая нялёгкая.

II

Першы раз я цябе сустрэў на гэтай станцыі... Потым мы ехалі на гнутым вазку. Ты была нейкая асаблівая. І можа, таму пачынала непакоіць рэўнасць і да твайго далёкага горада, і да тых людзей, якія жылі поруч з табою.

Але ў мілых вачах згледзеў столькі ціхага дакору, столькі шчырай прыязнасці і спачування, што язык не павярнуўся сказаць што-небудзь. А ты сказала:

— Цяпер і вы будзеце жыць па-людску...

Як хараша гэта гучала ў тваіх вуснах! Нават колы вазка пакаціліся па гасцінцы шпарчэй і, здавалася, таксама выгаварвалі:

— Людзьмі будзем... Людзьмі будзем...

III

А потым былі доўгія тыдні роздумаў і спадзяванняў. Дзе пазычыць, думаў я, тую адвагу, каб так вось, без дай прычыны зайсці ў школу і загаварыць хоць пра што-небудзь? Не, на гэта не хапала адвагі. Не мог я нават завітаць у тую суседчыну хату, дзе ты здымала пакойчык. Мог толькі хадзіць па вуліцы як апантаны і, нібы ў сне, слухаць размовы гаманкіх вясковых жанок наконт удалай «саветкі», нашай «красавітай вучылькі».

...А потым, помню, былі танцы. Проста ў школе. Ты падышла і ўпершыню ўсміхнулася мне:

— Станцуем?..

Мы танцавалі... А хлопцам заставалася толькі зайздросціць нам.

Пасля вечарынкі я цябе праводзіў да веснічак. Як добра мы памаўчалі ў той вечар!

IV

А памятаеш той дзень, калі я ўпершыню назваў цябе Ленкай? Не Аленай Васільеўнай, а Ленкай. Памятаеш?..

Мы ішлі лугам, па калені ў рамонках, і сонца адбівалася ў блакіце тваіх вачэй. Ты прабавала гасіць яго пад густымі трапяткімі вейкамі... Але яно не гасла...

Першы пацалунак. Праз рамонкі ў руцэ, якімі ты захіналася...

Раптам ты нечакана патушыла ў вачах наша сонца і заплакала ў палявыя кветкі.

Збянтэжаны і прысаромлены, я не ведаў, чым загладзіць сваю дуроту. Рваў рамонкі і моўчкі нёс іх табе. Цэлае бярэмя чароўных і чыстых кветак...

V

Іншы раз і цяпер я прынoшу дадому рамонкі. Стаўлю ў гліняны гарлачык і любуюся імі. Сонца, здаецца, згусцілася і застыла ў сардэчніку між белых пялёсткаў. Гляджу і ўспамінаю тыя рамонкі нашага першага спаткання.

Чамусьці кружыцца галава — ці ад водару, ці ад успамінаў. А кветкі глядзяць мне ў вочы і нібы дакараюць: «Эх ты, мужчына! Трымаеш сябе, як блазнюк, нежанатая ты чупрына! Што людзі скажуць?»

Рамонак, каліўца лугавой травінкі, а што яна робіць часамі з душой чалавека!..

VI

Памятаеш, я расказваў табе пра начлегі?

Сяджу, бывала, з такімі як сам, падшыванцамі ля вогнішча і гадзінамі слухаю іхнія пераказы пра лясныя страхі. Хтось падкідае ў зыркі жар сухія лапкі. З трэскам шугае ўверх вясёлае, гарачае полымя. Задуменны, я гляджу і гляджу ў агонь.

І ўжо здаецца мне, што гэта зусім і не полымя над вогнішчам, а гарачы, чырвоны штандар палыхае над калонай дэманстрантаў у пры-

садах панскага маёнтка... Мы тады чакалі бацьку да поўначы, а ён так і не вярнуўся дадому. Помню, у тую пару адцвітала ў нас груша на прыгуменні.

У той самы дзень адцвіло і маё маленства...

VII

Ты мяне разумела. О, як ты мяне разумела ў тыя далёкія дні! Помніш, мы напралёт праседжвалі доўгія зімовыя вечары ў тваім пакойчыку. Як толькі і цярпення табе ставала навучаць сялянскага хлапца разбірацца ў жыццёвай складанасці? За сцяною выла завіруха, а мы чыталі, чыталі, чыталі...

А потым ты вучыла такіх, як я, пераросткаў у вячэрняй школе. І шчыра, нібы дзіцянё, радавалася кожнаму новаму поспеху свайго выхаванца.

VIII

Наогул, як я цяпер разумею, ты была харошым педагогам. Нават тады, калі па ўсёй зямлі буяў сп'янелы ад кветак чэрвень, трапяталі, звінелі ў бяздонным небе мільёны жаўранкаў, а мы ішлі сцяжынаю праз поле. Памятаю: на хаду, як незнарок, сарвала ты валошку і ўпляла ў сваю льняную касу. А ў маю непадатлівую чупрыну, ужо жартуючы, уваткнула два вусатыя, у «красе», каласкі. «На красаванне»,— сказала і засмяялася.

Мы пабеглі ў гай і, змораныя спёкай, як снапы, упалі ў цень першай бярозы.

Памятаю, ты паказала на мурашак. Цугам, адна за адной яны шнуравалі па сваіх сцежач-

ках, маленькія і руплівыя, занятыя сваім нялёгкім клопатам. І нам іх стала шкада.

«Дапаможам?» — запыталіся твае вочы.

Мы збіралі ў хустачку сухую ігліцу і, узяўшыся за ражкі, насілі ў мурашнік.

Толькі ідучы дадому я ўспомніў пра свае каласкі.

IX

Вечарам да школы падляцела «эмка». Клікнуўшы цябе, каб падышла бліжэй, немаладая загадчыца райана шэптам, не выходзячы з машыны, распарадзілася:

— Леначка! Пакуль не знішчыш усё — ні з месца!

І, як жару схапіўшы, пакурэла ў змярканне, пакінуўшы ў вачах тваіх разгубленасць і трывогу.

...Гула полымем печка, глынаючы папкі, скруткі, партрэты. Калі дайшла чарга да кніг, ты апусціла рукі, села і залілася слязьмі.

— Не магу,— шапталі твае губы.— Не магу...

Прыбеглі хлапчукі і застылі ў здзіўленні: плакала настаўніца! А ты паглядзела на іх і ўжо больш спакойна сказала:

— Дзеці, разбірайце кнігі... Яны вам спатрэбяцца...

На шафе заставаўся яшчэ глобус. Ты сказала мне ціха: «Бяры». І я ўзяў. Звычайны, зялёны школьны глобус.

Разыходзіліся мы ўжо ўпоцемку, і мне здавалася, што нясу я дадому нашу пакутлівую планету.

X

Яна і цяпер стаіць у мяне на шафе, тая прыжураная, апаленая планета. Я ўсё часцей і часцей бяру яе ў рукі і чырвоным алоўкам замалёўваю кавалачкі абазначанай на ёй сушы. І радуюся за маіх далёкіх сяброў...

...Яшчэ зацемкам наступнага дня ты пастукала ў шыбіну і папрасіла:

— Правядзі.

Мы ішлі туды, дзе нясмелым сполахам пакрываўся далёкі небакрай. Дарога ўпіралася ў яго і, ружавеючы, раставала ўдалечыні. А потым на яе выкацілася вялізнае барвовае сонца і застыла ў нерашучасці.

— Дзякую,— прашаптала ты і, спяшаючыся, пайшла цвёрдай хадой.

Ты пайшла ў сонца.

XI

Дваццаць пяць разоў зелянеў і жоўкнуў наш бярозавы гай з тае пары. І ўсё-такі рос, і дзеці раслі ў безбацькоўскіх удовіных хатах...

Нарэшце ад цябе прыйшло пісьмо. Не мне. Проста ў вёску, без канкрэтнага адрасу. Людзі сказалі:

— Ці чуў, брыгадзір, аб'явілася наша вучыцелька?

Я глянуў на спісаны лісток са школьнага сшытка, і ўсё ва мне аж зайшлося. Ні да каго не звяртаючыся, ты пыталася, ці ўцалела вёска і як жывуць былыя твае вучні. І ўсё. Праўда, унізе быў яшчэ подпіс. І ні слова пра мяне. Ні слова! А на канверце — толькі штамп твайго горада.

Чаму ж ты так? Няўжо, чым жыў я ўсе тыя гады, было нязбытнай марай? Я не верыў гэтаму, не верыў!

Няўжо магло што здарыцца і там? Я ж пісаў табе з партызанскага атрада на Вялікую зямлю. Але ніводнага разу ты не парадавала мяне весточкай. Я напісаў табе і з прыступак палаючага рэйхстага... Нарэшце, вяртаючыся дадому з таго пекла, я спачатку паехаў туды, дзе спадзяваўся знайсці цябе. Але не адшукаў і слядоў тваіх.

XII

Тое пісьмо паклікала мяне зноў у дарогу. Ішоў на станцыю і найболей вінаваціў сябе. За тое, што пусціў цябе тады, праводзячы, адну...

Твой горад сустрэў мяне непрыветна. Уздумалася нечага пайсці дажджу. Па лужынах я прыплёўся да аддзела міліцыі і вымаліў твой адрас.

А кватэра твая сустрэла мяне замком. Зайсці ў школу? Дай, думаю, спачатку пазваню.

— Алену Васільеўну можна?

— Зараз паклічу,— паабяцаў мілагучны голас.

Прайшла цэлая вечнасць, пакуль я пачуў твой... такі знаёмы і блізкі:

— Слухаю вас!..

— Ленка! Ленка, гэта ты?!

У адказ — маўчанне. І я закрычаў што было сілы:

— Ленка! Я знайшоў цябе, Ленка!..

— О, божа! — пачулася ў трубцы і змоўкла. Хвілін колькі я слухаў толькі тваё дыханне, перарывістае, прыглушанае. І хоць бы слова... А потым надакучліва, да болю заныў зумер.

Разгублены, сам не свой, я зноў набраў твой нумар. Чужы голас адказаў:

— Прашу вас больш не званіць. Алена Васільеўна прасіла... І ўвогуле, вам лепш пакінуць яе ў спакоі.

XIII

Мокры, стомлены, я крочыў назад на вакзал. Думалася толькі аб адным: упасці б дзе-небудзь і, забыўшыся пра ўсё на свеце, патануць у глыбокім сне.

У вагоне адшукаў незанятае месца, але чамусьці не спалася. Відаць было, як за акном па пероне снавалі праваднікі ў чаканні адпраўкі поезда. З вакзала выйшаў высокі мужчына ў галіфэ і зялёнай фуфайцы. Ён, мабыць, недзе «клюнуў», бо прыкметна зыбаўся ў бакі і спрабаваў нешта заспяваць. Я глядзеў у акно і зайздросціў яго бесклапотнасці і добраму настрою.

— Зноў напіўся... Не лёгка з ім Алене Васільеўне,— заўважыў мой сусед па лаўцы, мабыць, палічыўшы мяне за мясцовага.

Яго словы, як нажом, разанулі мне па сэрцу, і я спытаў:

— Адкуль вы яе ведаеце?

— Вось табе на, адкуль! Разам працуем. І ваявалі ў адным атрадзе.

І, не скупячыся, як свайму, расказаў пра цябе ўсё, што ведаў. Цяпер ведаю і я.

XIV

...Шмат дзён уцякала ты ад вайны. Дзе пеша, дзе на спадарожнай палутарцы. Палаючы Мінск таксама правёў цябе далей, на ўсход. Але да сонца ты тады не дайшла. Яго засланілі хмары.

Толькі праменьчыкі ўсё ж прабіваліся іншы раз праз тыя хмары. Не-не — і прылятала вестка ў глухую вёсачку, дзе знайшла ты прыстанішча, і будзіла ў табе надзею. Яе прыносілі з-за Бярэзіны лясныя хлопцы. І табе было сорамна, што гэтага не можаш рабіць ты.

Аднойчы, калі на ўгрэве пачала ўжо на купінах адскокваць купавіца-асака і карацейшымі сталі ночы, прыйшлі праз балота тыя лясныя хлопцы і сказалі:

— Хутчэй, збірайся!

І ты з радасцю паляцела насустрач новаму дню.

XV

Лес прыняў цябе як сваю, родную. Мажныя дубы і танклявыя бярозкі здзіўляліся тваёй цягавітасці. Ты магла цалюткімі днямі мыць заношаную бялізну, рыхтаваць немудроны партызанскі абед. І цябе палюбілі яны, як дачку, як сястру.

Але праз цябе там страціў спакой камандзір узвода разведчыкаў. Вяртаючыся з нялёгкіх начных паходаў, ён знаходзіў цябе, садзіўся паводдаль на пяньчук і, не зводзячы з цябе вачэй, пагадзінамі любаваўся табою. Так любуецца палярнік, вярнуўшыся ў родныя мясціны, яркай палявой кветкай. А ты нічога не ведала.

А каб і ведала, то баялася б нават падумаць пра гэта...

XVI

А потым здарылася так, што ты стала разведчыцай. Баявой і смелай разведчыцай. Лясныя кастры і сцюдзёныя ветры загартавалі тваё сэрца, і яно бязлітасным было да ворага.

Аднойчы вы неўспадзеўкі наткнуліся на засаду. Адступаць было позна. Адно выйсце — прарвацца.

І калі варожая граната чмякнулася вам пад ногі і вось-вось павінна была разарваць сакавіцкую ноч, ты грудзьмі засланіла свайго камандзіра.

...Ён доўга нёс цябе ў лагер, непрытомную, і на твар твой падаў капеж з бяроз.

XVII

Калі прыйшоў ён, ужо ў раённую бальніцу, і прыглушана сказаў: «Ну што ж, хадзем», ты пакорна пайшла за ім. Ты не плакала тады. Ты глушыла слёзы і боль свой, не даючы ім вырвацца на свабоду. І гэта ўдавалася табе.

А потым пашыла кофтачку з доўгімі рукавамі. Ты хацела хоць крыху прыкрыць сваё калецтва...

XVIII

А сёння, узяўшы з сабою прыкрую горыч, светлыя надзеі і непрыглушаныя гадамі трывогі, я зноў пайшоў у дарогу.


Я крочыў туды, дзе нясмелым сполахам пакрываўся далёкі небакрай. Дарога ўпіралася ў яго і, ружавеючы, раставала ўдалечыні.

А потым на яе выкацілася вялізнае барвовае сонца і, здавалася, увесь свет заліло праменнямі.

І я паскараю хаду. Іду да цябе. Да свайго незакатнага сонца...



навелы



АКНО

Калі здараецца наведаць сваю вёску, абавязкова заскочу да Аўдзея, што жыве ў камяніцы насупраць клуба. Бывае, спытаю мімаходзь:

— Ну, як жыццё-быццё ваша?

Чалавек не вельмі ахвочы да гаворкі, але не замарудзіць і скажа:

— Жывём ніштавата. І шкварка ёсць, і да шкваркі не выводзіцца. Хату вунь якую займеў! І ўнука, даў бог, прыдбаў...

...А было і такое. Усе помняць, як падвыпіўшыя хлопцы з будаўнічай брыгады «перасялялі» Аўдзея з хутара. Прыехалі, кажуць: так і так, праўленне рашыла даць вам новы дом. Збірайцеся.

— Я сказаў: не пайду — і ўсё! — агрызаўся Аўдзей.— Паміраць і тут не цесна.

— Дык хата струхлявела ўся!

— Ты сам струхлявеў!..

Пакуль ён вёў перапалку з брыгадзірам, хлопцы пагрузілі пажыткі хутараніна, сілком пасадзілі на клункі цётку Альжбету і газанулі ў вёску.

— Судзіцца! Судзіцца будзем! — чулася наўздагон машыне.

Але судзіцца Аўдзей не стаў. Казалі жанкі,

што прыцемкам прыйшоў і ён у вёску. А ледзь заднела, уважліва агледзеў адведзены яму пляц, мацаў вузлаватымі пальцамі чырвоныя цагліны пабудовы і буркатаў:

— Ці не заразы! Такі тавар перавялі! Яго якраз на чэрава ў печ класці. Зносу не было б. А яны з дабра хату зляпілі...

Праз тыдзень з горада пераехаў і адзіны сын былога хутараніна. І калі таго прызначылі загадчыкам фермы — павесялеў стары Аўдзей.

...Зносілі старую хату пад восень. Гаспадар таксама прысунуўся туды, стаяў, смаліў самасад, а калі справа дайшла да вокан, ажывіўся:

— Стой, хлопцы, пачакай! Дайце мне адно... На памяць...

Праз хвіліну Аўдзей трымаў у руцэ маленькае, на паўаршына, акенца і вінавата ўсміхаўся:

— Падрасце ўнук — пакажу, праз што на свет божы глядзеў...

А хлопцы рагаталі:

— Ну, дзед, з цябе хоць паэму рабі!..

НА ВІДАВОКУ

У нашым сяле быў звычай ніколі не завешваць акон. І калі вечарамі запальваліся ў хатах газнічкі, то з вуліцы можна было, як на далоні, бачыць, хто што вячэрае. І толькі Саўкава хата была да вуліцы не вокнамі, а глухой сцяной. Аднак людзі ведалі, што Саўка-бабыль, як звечарэе, заўсёды сядзіць на покуці і чытае біблію.

У саракавым годзе, калі ў нас выдалася дужа лютая зіма, Саўка амаль не выходзіў за веснічкі. Гаварылі, што ён вычытаў хуткую канчыну свету і, каб заслужыць у бога збавенне, усё гартаў і гартаў сваю біблію.

Барсуком прасядзеў Саўка ў сваёй нары і ўсю вайну. А калі ўгаманілася ўсё на свеце, выйшаў да жанок і сказаў:

— У святым пісанні сказана: хто з мечам прыйдзе...

Напрадвесні Саўка нечакана памёр. І толькі тады даведалася вёска, што ў яго ёсць браценік. Ён прыехаў недзе праз месяц пасля смерці Саўкі, прадаў хату былому партызанскаму разведчыку аднаногаму музыканту Сцёпку і назусім знік .

А Сцёпка назаўтра сабраў мужыкоў-пабрацімаў і пачаў перасыпаць хату.

Вокнамі на ўсход...

БАЦЬКАВА ПЕСНЯ

Як добра ў матчынай хаце!

І на гэты раз мяне разбудзіла песня. Бацькава песня... Ляжаў, як некалі, баючыся расплюшчыць вочы, і слухаў:

— Дзінь-дзень! Дзінь-дзень!..

Уяўлялася: бацька губатымі абцугамі толькі што выняў з горна сонечны кавалак разамлелага жалеза, ударае па ім молатам, і з тае зыркай жалезіны сыплюцца на гліняны дол мільёны зор...

І вось ужо ля ног бацькі, сыходзячы гаркаватай парай, ляжыць падкова.

Ёю падкуюць Гнядую ці Дэраша. А потым тую падкову вясною нехта знойдзе на дарозе. І прыб'е да свайго парога. На шчасце.

А бацька зноў будзе заняты сваёй звычайнай справай. Будзе кожнай раніцай даставаць абцугамі з горна кавалкі сонца. І зноў будзе ліцца над нашым сялом знаёмая музыка:

— Дзінь-дзень, дзінь-дзень...

СТАРЫЯ БЛІНДАЖЫ

Іх некалькі было на пагорку за вёскаю. Калі, бывала, падыдзеш да канцавой хаты і кінеш вокам на выган, то здавалася, што гэта зусім і не бліндажы, а вялізныя, счарнелыя ад часу чарапы. Горш за ўсё яны заміналі нашым трактарыстам. І талакой рашыла сяло знішчыць іх.

Узрыўчатку выпрасілі ў леспрамгасе, а кіраваць усёй «аперацыяй» даручылі дзядзьку Антосю.

— Гэта мы мігам,— ажывіўся ён.— Як карова языком зліжа... На фронце не такое рабілі!

І праўда. Толькі варта падкласці куды трэба толу, адбегчыся і скамандаваць: «Ла-а-жысь!», а нам упасці жыватамі ў пясок, як глуха вухала і скаланалася зямля. Ад бліндажа, сапраўды, заставаўся адзін успамін.

Потым зноў дзядзька браў свае прычындалы і клыпаў на «новы рубеж». Ды на гэты раз ён выйшаў з бліндажа і не кінуўся подбегам у наш бок, а пачаў спакойна ўзірацца ў блакітнае неба.

І чаго б гэта?..

Мы сыпанулі туды. Глядзім: укленчыў дзядзька і паклаў на далонь... птушаня:

— Та-ак...

І дадаў, паказваючы на бліндаж:

— А гэты... Няхай пастаіць!..

БЫЦЬ ПАГОДЗЕ!

Нешта не спіцца сёння. За шыбамі — ажно буяе ў садку вясна. Водар яе прасочваецца ў хату і ап'яняе. І паспрабуй, не расчыні акно!

Як бамбавозы, гудуць хрушчы. Адзін разагнаўся і звонка бразнуўся ў шыбіну.

— Быццам куля,— гаворыць маці.

Ёй таксама не спіцца. Пэўна, і яна думае пра вясну...

— Заўтра дзевятае мая...

— Дзевятае...

І зноў маўчым. Ужо за акном паснулі вішні. Задрамала, здаецца, і старая яблыня...

Я ведаю: хоць і засне яна, ды ненадоўга. І неспакойны, трывожны сон у яе. І часта скрыпіць і стогне ўначы. Гэта — калі падкрадаецца непагадзь. Бо смыляць, нясцерпна ныюць старыя, ад асколкаў, раны.

— Быць пагодзе!— раптам гаворыць маці.

Я слухаю ноч. Сапраўды, яблыня маўчала.

БУСЛЫ

Мы часта гулялі на Міколчыным гумнішчы ў «жабкі». З намі бавіла час і пазалочаная драбнюткімі рабацінкамі Наташка. І калі нізка над прысадамі пралятаў цыбаты бусел, яна заўсёды пляскала ў далонькі:

Бусел, бусел-клекатун,
Паймаў жабу за каўтун...

А Міколка яго цярпець не мог. Ускокваў, нібы яго пеканула аса, і шпарыў у хату, ляментуючы:

— Ма-а-ма! Зачыняй комін! А то бусел... зноў дзіця ляпне на прыпек!..

У Міколкі было многа брацікаў і сястрычак.

Маці выходзіла з хаты і ўсміхалася:

— Дурненькі... Бог дасць, пагадуемся.

...Я ўспомніў гэта, калі нядаўна завітаў у родную вёску. Ля старой разгалістай і пакалечанай вайною ліпы стаяла маладая жанчына са знаёмымі рабацінкамі і гукала ў вышыню:

— То злазь, Мікола! Полудзень здубянее!

Праз хвіліну з галін ліпы вылез дзяцюк — ладны, каржакаваты і вінавата апраўдваўся:

— Ды вось... буслянку прыладжваў.

І ён, пазнаўшы мяне, сарамліва ўсміхнуўся...

ЖЭЎЖЫКІ

Яны сядзяць недалёка ад хаты, на выгане, і ў чаканні бацькі-трактарыста ляніва перасыпаюць бляшанкай пясок. Раптам Мікітка ні з таго ні з сяго крычыць:

— Колька! А я нешта знайшоў!..

— Што ты знайшоў? — пытае Міколка.

Мікітка на поўным сур'ёзе паказвае брату мурзатую «дулю» і «падмазвае» пяткі.

Міколка старэйшы на год і таму спрытнейшы. Ён насцігае брата, і пачынаецца тузаніна. Падбягаюць меншыя, і над выганам уздымаецца вэрхал. Тады з гародчыка выходзіць Аўдоцця:

— Супакойцеся! А то я вам...

Але дзе там! Ніякай увагі... І тады Аўдоцця падымае з зямлі дубец.

— А ну, пайшлі ў хату, жэўжыкі! — крычыць яна, як і раней, незлабліва, але больш грозна.— Узялі ў звычку біціся...

І яна, як гусянят, лазовым дубцом гоніць іх з выгану на падворак.

Нарэшце прыязджае бацька, ставіць пад павеццю матацыкл і, зразумеўшы, што адбылося, гаворыць:

— Трэ было паскам. І добранька...

...А сам ніколі не здыме паска на сваіх жэўжыкаў.

ДАЖЫЛІ, ШЭЛЬМЫ!

Вечарэла. За лагчынай, дзе расло некалькі каржакаватых дубоў, мяне аклікнуў знаёмы голас:

— От добра, што стрэліся! — радаваўся гаваркі ляснік.— Хадзем, паглядзіш, як дармаедаў глумяць.

Я спачатку не ўцяміў, што да чаго. Дайшло, калі падышлі да старога дуба і ляснік тыцнуў пальцам амаль у самую дуплянку:

— Глядзі, зноў валакуць!

Я заўважыў там цэлую працэсію. Некалькі пчолак цягнула за крылы трутня. Ён упіраўся. Але, сапхнуты з сука вёрткімі гаспадынямі, усё ж зваліўся на зямлю.

Там была іх цэлая плойма! Яны поўзалі па галінках ломкага верасу, не знаходзячы сабе месца. А ляснік не сунімаўся здзеквацца:

— Дажылі, шэльмы, што і на парукі не бяруць...

А з лагчыны цягнула першым замаразкам.

УПАРТЫ ЦВІК

Білі толькі па галаве, наводмаш, з размаху, аж пошчак нёсся на ўсю сталярку. А ён упёрся тонкім носам у асінавы сук і, не раздумваючы, заявіў:

— Не паддамся.

— Так-так...— малаток не любіў непаслухмянства і зноў бацнуў цвіку па галаве.

Сыпанулі іскры, і стала горача. І хоць згінаўся ў тры пагібелі пад цяжарам удараў, не змяніў свайго намеру. Нават калі сціснулі яго за бакі шчарбатыя абцугі і са злосцю шпурнулі ў кут, цвік не пакінуў упарціцца:

— Ну што? Чыя праўда?..

ДЫВАНЫ

Панаваў няпісаны закон у нашым сяле: да вялікадня кроснаў у хаце каб і не было. І таму здорава даставалася нам у тыя перадсвяточныя дні. Бо сукаць цэўкі была доля падлеткаў. І дазвалялася выбягаць на сонца, толькі як вырастала ля кроснаў ладная куча каляровых «пачаткаў», а далоні гарэлі нясцерпным агнём.

...Нарэшце маці распускала з сувоя квяцістае палотнішча з бярозкамі і гарлапаністымі пеўнямі. І ўздыхалі мы з палёгкай...

Цяпер не ткуць дываноў у нашым сяле. Але, калі бываю ў матчынай хаце, не асмельваюся і ступіць на іх.

Каб не пакрыўдзіць рук чалавечых...

МОЙ НОВЫ ЗНАЁМЫ

Пасярод вуліцы, у гарачым, як прысак, пяску стаіць хлапчанё і ўсхліпвае. Пад носам бурбалка — то пакажацца, то зноў схаваецца.

— Ты чаго, Іван Іванавіч, журышся тут? Пакрыўдзілі?

— Не-а!..

— Дык што такое, зяцёк?

— Хо-ла-дна!.. — выцірае мурзатай далонькай бурбалку мой субяседнік.

— Каму, табе холадна? У спякоту?..

— Не-а!.. Во ім... птусацкам,— і расхінае кашулю.

Божа мой! За пазухай у хлапчаняці камячком, з сінімі, як сліва-вадзянка, жыватамі корпаюцца і ціўкаюць птушаняты.

— Дзе ж ты іх узяў, сынок? — пытаюся.

— Тыцкаю... З гняздзецка...— і рукою паказаў на падстрэшша хаты.

— Тычкаю?.. З гняздзечка?.. І не змог назад палажыць?..

Пакуль я, стаўшы на падаконнік, заканапачваў пакуллем прабоіну ў гняздзе і адно за адным усаджваў туды ластаўчыных птушанят, хлапчанё ўсміхалася ад вуха да вуха — на ўвесь свой мурзаты роцік.

БЭЗ

...Шмат гадоў мінула з таго дня. Не раз прыходзіла вясна і прыносіла ў вёску бярэмі бэзу.

Расцвітае той бэз і перад вокнамі Таклюсінай хаты. Але ўсё не адважыцца старая разам з усімі жанкамі выйсці ў святочны дзень на вуліцу, сесці на прызбу і любавацца і сонечным днём, і гэтым пахучым бэзам. Ёй і цяпер здаецца, што варта адчыніць дзверы, як пачуе страшныя, тады яшчэ сказаныя словы:

— Маці здрадніка...

І яна сядзіць ля акна, уздыхае і шэпча:

— Лепш нарадзіла б яго нежывога...

ПУШЧАНСКАЯ ПАЭМА

I

Я сустрэў яго нечакана, пасярод сонечнай паляны.

А потым доўга хадзіў лясной прасекай і думаў: чаго больш было ў сэрцы гэтага чалавека? Любві? Нянавісці?..

Калі зноў выйшаў на паляну, убачыў: перад ім стаяла... яна. Моўчкі. Як перад святыняй...

Няёмка было трывожыць, і я спыніўся. І хораша падумалася пра жанчыну: бач, не палічылася ні з часам, ні з дарогай... Глядзеў на яе, і здавалася: яшчэ хвіліна — і яна кінецца на шыю хлопцу, прыпадзе да яго, а ён прытуліць яе да шырокіх грудзей і скажа:

— Да сустрэчы, доля мая...

А яна толькі нахілілася ў нізкім паклоне, паклала на граніт букет веснавых кветак і ціхай хадой, не азіраючыся, пайшла ў бок вёскі.

II

Толькі вечарам я вярнуўся дадому. Гаспадар, у хаце якога знайшоў я часовы прытулак у тыя дні, сустрэў мяне ветліва. Устаў з-за стала,

паволі прарыпаў пратэзам у мой бок і ціха сказаў:

— Прысядзь, кватарант... Дваім весялей...

А сам — не прысеў. А сам — рыпаў і рыпаў сваім пратэзам. І толькі чаркі сіратліва адзываліся на стале.

Гаспадар уважліва паглядзеў на мяне і сказаў:

— Ты не думай, што я... У мяне сёння...

III

Мы не лажыліся ў той вечар. Мы прагаварылі да самай раніцы.

Больш за ўсё гаварыў ён. О! Як я ў тую ноч дакараў сябе, што нарадзіўся так позна! Асабліва балюча стала на душы, калі гаспадар дастаў з шафы сваю паліняную і абшарпаную гадамі скрыпку...

Ён іграў, а перад маімі вачыма паўставалі малюнкі тых далёкіх векапомных восеньскіх дзён. Я выразна бачыў, як людзі выбягалі з падслепаватых хацін сустракаць сваіх збавіцеляў... Як дзяўчаты, не саромячыся сваіх нарачоных, кідаліся на грудзі незнаёмым салдатам... Як дзяды плакалі ад шчасця...

Скрыпка пела і радавалася... І ў песні гэтай было многа-многа і цяпла і сонца.

IV

А потым хата напоўнілася рокатам. Нават задрыжэлі шыбіны, нават ноч за акном ад нечаканасці прыжмурыла вачаняты-зоры...

А я бачыў, як над зялёнай маёй зямлёй плылі страшылішчы з чорнымі крыжамі на крылах,

як закаваныя ў жалеза нелюдзі сеялі смерць у маім краі.

Я бачыў яшчэ, як не спалохаліся той смерці двое салдат-пагранічнікаў. І чуў, як ракатаў кулямёт. І бачыў, як падалі ворагі... Зноў ракатаў кулямёт, і зноў падалі ворагі...

А потым — гэтак выразна:

— Адпомсці... За мяне...

І ўжо зусім ціха:

— Пра дачку не забудзь, браток...

V

Ціха плакала скрыпка. Перапоўненая болем яе душа, здавалася, вылівала свой найвялікшы смутак.

Але такое было толькі імгненне. Праз хвіліну яна загаварыла спакойна і ўпэўнена.

Гэтак гамоняць сосны. Гэтак гамоняць дубы перад бурай. Так гаманіў, пэўна, калісь і наш нескароны партызанскі край...

Потым у гэты пушчанскі гоман стомленых струн, паволі набіраючы сілы, уліўся голас бадзёрай і вясёлай песні.

VI

Скрыпка аж заходзілася ад радасці. І здавалася мне, што зноў іду пушчанскай прасекай да самага святога месца на гэтай зямлі...

А пушча да краёў налілася і сонцам і птушынымі песнямі. І скрозь гэты перазвон праменняў і песень ледзь-ледзь да слыху майго дайшлі апошнія дзядзькавы словы:

— А тая?.. Што была з букетам палявых кветак?.. Хто яе ведае... Туды ходзяць усе...

РАМОНАК НА ШЫБІНЕ

Нас у аўтобусе — самы раз: ніхто не стаіць.

Дзядзька сядзіць як на троне: расшпіліў у кажушку верхнія гузікі, абапёрся на ядлоўцавы кіёк і пазірае перад сабою строга, паверх галоў.

Маладзіца — наадварот. У яе выгляд такі, нібы хоча падкрэсліць: глядзіце, якія мы!..

А дзяўчынка хвілін колькі сядзела з прыплюшчанымі вачыма і ў куточках вуснаў хавала сваю ўсмешку. Потым адважылася, зняла рукавічку і ружовым пальчыкам пачала вадзіць па заінелай шыбіне.

Яна, мабыць, такое рабіла не першы раз. Бо на шыбіне смела з'явіліся кружочкі, рысачкі і палосачкі. А калі аўтобус зрабіў паварот і маладое сонца пазалаціла праменнямі шыбіну, мы ўсе ўбачылі, як пад рукою дзяўчынкі ўспыхнула вясновае цуда — кветка...

І ўсміхнуўся гэтаму цуду пажылы, самавіты дзядзька, па-веснавому шчырэйшай зрабілася маладзіца...

На наступным прыпынку дзяўчынка ўсхапілася з месца і пабегла да дзвярэй.

А на шыбіне ўсю дарогу гарэў пакінуты ёю рамонак.

У ПАРКУ

Недзе там, над галавой, кіпела жыццё. І ён напружыў сілы, каб выпрастацца і падняцца да святла. Але не змог. Над ім быў чорны, як ноч, пласт шурпатага асфальту.

Адпачыўшы, кожнай раніцай зноў браўся, здавалася, за непасільную работу, адваёўваючы сваю будучыню ў цемры. І яна адступіла. Мы бачылі, як на асфальтаванай дарожцы парку стаяў маладзенькі дубок і радаваўся першай у сваім жыцці вясне.

Спыняліся людзі. Адны здзіўляліся такой напорыстасці, другія, нібы справа ішла пра асуджанага, спагадліва гаварылі:

— Не жылец...

Падышоў садоўнік. Моўчкі агледзеў тое месца. Потым прынёс рыдлёўку і асцярожна, нібы дзіцянё, перанёс і пасадзіў дубок на алеі.

І я ведаў: такі будзе жыць!

БЯРОЗКА

Толькі другую вясну сустракае яна ў нашым горадзе. Не забыліся яшчэ малюнкі роднага ўзлесся, кучаравыя сяброўкі. Памятае яна і маленькага пяюна-салаўя...

І ці не таму мінулай восенню паслала яна ім свае лісты-пісьмы. Хацела расказаць, што палюбіўся горад, звонкая дзятва, якой шчодра дарыла ў гарачы поўдзень сваю пакуль яшчэ небагатую прахалоду. Нават тутэйшы паштальён-вецер тады імкнуўся памагчы ёй. Набраў поўны ахапак залатых лістоў і подбегам нёс іх па вуліцы...

А сёння — яна плакала. Як дзяўчынка... Чыясьці жорсткая рука надламала галінку. І слёзы, горкія, гарачыя слёзы, падалі на прыпудраны пылам асфальт...

Я моўчкі стаяў і думаў. Думаў пра найвялікшае на свеце — пра жыццё. Пра сэрцы добрыя і чэрствыя...

КАСАЧЫ

Яшчэ і не думалася брацца на досвітак, як разбудзіў мяне бацька.

Усхапіўся з ложка і, успомніўшы сваю ўчарашнюю просьбу, борздзенька нацягнуў нагавіцы і «ўтапіўся» ў старых ялавых ботах, што ўсю ноч сушыліся за комінам.

Маці сказала:

— З пустымі рукамі — ні на парог!..

— Як пашчасціць! — усміхнуўся бацька і ўзяўся за дубальтоўку.

Мы ішлі спачатку загуменнем, потым звярнулі ў лагчыну, што парасла за сялом рэдкім ядлоўцам, перасеклі гонкі сасоннік, у вершалінах якога спакойна гойдаўся, нібы човен на прывязі, маладзік, прайшлі куп'істае балотца, прыхопленае начным прымаразкам і, нарэшце, нырнулі ў бярозавы гушчар. Блеклае святло маладзіка то там, то тут успыхвала сярод белых камлёў і нясмела гарэла на кончыку дубальтоўкі...

Зашыўшыся ў стары будан, пачалі чакаць раніцы.

— Ты паглядзі, што робіцца! — тарканўў мяне бацька.

Я схамянуўся і пачаў узірацца праз акенца будана. А бацька ажно не знаходзіў месца:

— Не раўнуючы, галавешкі! — чуўся яго стрыманы шэпт.— З адлівам...

Сапраўды, на ружовай ад першых промняў паляне, растапырыўшы крылы, перабягалі на сушэйшае месца касачы.

— Ажно стогнуць! — не стрымліваецца бацька.

Непадалёку спыніліся два касачы. І пачалі наступаць адзін на аднаго, распушыўшы хвасты, сярдзіта дзерлі лапамі леташнюю злёглую траву.

— Чхы-чхы-цюрр! — нібы драў хто сухую лучыну.

— І трэ так раз'ярыцца! — забыўшыся пра дубальтоўку, кажа сам сабе бацька і здымае шапку.— Ну, каторы з вас? Ну!.. Ах!..

Ён узмахвае рукою, хоча пляснуць сабе па калену, але стрымліваецца.

— Ах, ядры вас!..— толькі выдыхае бацька.

А яны ўжо ажно падскоквалі, выцягнуўшы доўгія шыі, палохалі адзін аднаго. А потым забілі па зямлі крыламі і пачалі дражніцца:

— Фар-сун!

— Ффарр-сун!..

— Ой, каб вас немач! — смяюцца бацькавы вочы, і я бачу, як наліваюцца яны цеплынёй. А касачы, пэўна, зразумеўшы, што ні ўзаемныя пагрозы, ні тое абразлівае «фар-сун!» не зменяць становішча, вырашылі рызыкнуць на большае. Крок — і пучок травы ляціць у паветра... Крок — і жменя пяску ўзлятае над такавішчам... Вось яны зусім блізка... Топчуцца... У нерашучасці... І раптам — схапіліся за дзюбы. І замерлі. У роздуме...

Мне відно, як наліліся гарачай крывёю надброўі птушак, і хочацца закрычаць. Але голас

прапаў, як у сне. Толькі ў здзіўленні варушу губамі...

— Ах, камар цябе закалі! — вылаяўся бацька і расшпіліў гузік на каўняры.

Касач, што быў па правую руку, раптам пацягнуў на сябе саперніка, падскочыў і што сілы ўдарыў яму ў грудзі вострымі лапамі. І той зразумеў, што тут не вельмі пацягаешся, адбегся і, фыркнуўшы ў роспачы «фар-сун!», залапатаў крыламі ў бок сасонніку.

І тады прыляцела аднекуль і ўпала ў траву сяброўка. На многа меншая і не такая фанабэрыстая. Касач-пераможца патаптаўся крыху і, горды, павёў яе ў бліжні бярэзнік.

Там, на купаўі, былі яшчэ леташнія журавіны...

АМЯЛА

Мы ляжым, скінуўшы стому, і глядзім, як бярозы наліваюцца духмяным салодкім сокам. Галінкі расчыняюць кулачкі-пупышкі, і адтуль выпстрыкваюць вясёлыя лісточкі — дальбог, гэта можна заўважыць, калі паляжаць хоць бы гадзіну... Толькі адна бяроза стаіць панурая.

— Бач, памірае,— задуменна кажа Яўхім.— У сухоты ўвагналі...

Я жахнуўся, глянуўшы ўгару. На плячах бярозы зялёнымі шапкамі гарэла ўчэпістае, настырнае стварэнне.

— У нас байка ходзіць пра амялу,— працягвае стары ляснік.— Бог не надзяліў яе ростам. Ды рашыла ўсё ж амяла паказаць сябе, з вышыні на другіх глянуць. І кажа бярозе: «Пусці на вяршаліну. На адзін дзень пусці». Тая, ведама, добрай натуры, дазволіла... З тае пары і жыве амяла ў падсуседзях, на чужым хлебе пасецца...

Яўхім сярдзіта плюнуў і змоўк.

...Такое бывае не толькі з дрэвамі.

АЛЕНІ

I

Першае, што адчула тады алянё, гэта — глухую стомленасць. Яна спавіла ўсё цела і, здавалася, ніколі ўжо не пакіне. Але стома неўзабаве пачала сплываць, а на змену ёй з'яўлялася радасць.

Яму радасна было ад дотыку галінкі, ад подыху ветрыка. Халаднаватасць травы, на якой яно ляжала, супакойвала і нібы здымала трывогу перад невядомасцю. А сонечныя промні сыходзілі ласкай і духмянілі — ажно кружылася галава. І алянё, сп'янелае ад усяго гэтага, не вытрымала і патанула ў першым сне...

І не бачыла, як маці дарыла яму сваю пяшчоту. Адчувала толькі побач з сабой нешта незвычайна блізкае, ад чаго спакайнела, шчасліва прыжмурвала вочы, нібы прыслухоўвалася да самога сябе, нібы хацела зразумець: што да чаго.

Нарэшце вырвалася з салодкага палону і ўбачыла: маці стаяла над ім, вялікая і зразумелая, абдавала гарачым дыханнем і не пераставала прыхарошваць яго... Потым злёгку падштурхнула і прымусіла падняцца. І яно паслухалася, усхапілася і, хістаючыся на неакрэплых

яшчэ нагах, прагна прыпала да цёплага вымені...

Алянё адчула, як цела наліваецца вясёлай сілай, і, асмялелае, зрабіла першы крок. У жыццё.

За ім горда ступала маці...

II

Аднойчы на світанні разбудзіў іх дзяцел, і яны пакінулі сваё часовае прыстанішча. Спачатку прадзіраліся густым падлескам, потым абышлі топкае балота і нарэшце выбраліся на паляну.

І тут убачылі бацьку.

Ён стаяў пасярод паляны, на невялікім пагорку. Прыгожы і дужы... Ён трымаў на рагах... сонца.

Малое даверылася канчаткова... Па ледзь улоўнаму паху навучылася знаходзіць смачнейшую траву.

І за ўсё гэта было ўдзячна яму...

А ў той спякотны поўдзень, калі яны з маці адпачывалі ў маладым асінніку, а бацька стаяў пад разгалістым дубам, здарылася неверагоднае: нечакана грымнуў стрэл... Бацька кінуўся ў асіннік і, ледзь дабегшы да іх, упаў на калені — усё роўна як прасіў паратунку. І ўбачылі яны, як на яго левай лапатцы расплывалася чырвоная пляма...

Да іх беглі незнаёмыя істоты. І маці першай кінулася прэч.

Калі апынуліся на трыбе, непадалёку ад таго месца, дзе некалі было іх першае прыстанішча, зноў убачылі незнаёмую істоту. Яна спакойна ішла насустрач...

Маці застыла, як скамянела. А потым, забыўшы пра ўсё на свеце, кінулася з трыбы, струшчыла куст алешніку і знікла з вачэй. Аляне нейкі час бегла следам, потым заблыталася ў высознай траве і ўпала ў знямозе. Задыхаючыся, яно чула, як недзе там, за асакой, дзе знікла маці, захлюпала твань. А потым — усё сцішылася...

III

Яго, кволага і знямоглага, падняў ляснік...

— Сірата,— сказаў ён.— Трэба выхадзіць!

Але доўга яшчэ алянё палохалася чалавечага голасу, уздрыгвала ад дотыку рук. Цяжка было прызвычаіцца да іх, зразумець, што людзі могуць быць бяскрыўднымі і добрымі.

Паступова забываўся страх, а ў сэрцы з'яўлялася ціхая даверлівасць. Усё радзей сніліся аляняці, і родная паляна, і бацькавы рогі, і матчына вымя... Але калі пярэзімкам прывялі яго вясною ў лес і на поўныя грудзі ўдыхнуў той водар, мінулае ўсплыло зноў у памяці...

Зрабіў крок, азірнуўся, не верачы ўсяму гэтаму, і ўбачыў, як усміхнуўся яму чалавек:

— Ідзі! Жыві!..

...Ён доўга блукаў па лесе — спадзяваўся адшукаць сваіх, але нідзе іх не знаходзіў. Іншы раз трапляў на след незнаёмага табуна, толькі стары важак чамусьці не прымаў яго.

У нялёгкіх клопатах і турботах праляцелі вясна, лета, восень. Ззаду засталася яшчэ адна зіма, пакутлівая і завейная. Потым зноў надышлі цёплыя дні...

Аднойчы, у час вадапою, здзівіўся: з люстранога азярца на яго пазіраў дарослы алень...

IV

А ў гэту восеньскую ноч ён нават не звёў і павек.

З ім нешта рабілася... Ішоў між асін і соснаў і адчуваў, як бунтавала кроў, а маладое тугое цела налівалася нязвыклай сілай.

Ля знаёмага дуба спыніўся, прыпаў гарачымі губамі да шурпатай кары, а потым упёрся рагамі ў тоўсты камель. Работы прасілі і ногі — капыты дзёрлі дол і разам са шматкамі імху кідалі ў бакі камякі зямлі.

Потым ён зразумеў, што робіць не тое. Узняў прыгожую галаў і ў роздуме затрубіў і доўга стаяў і слухаў, як магутнае рэха перакатвалася па вяршалінах дрэў. Яно, тое рэха, неўзабаве вярнулася назад, але было нейкім чужым і незразумелым. Як выклік.

І тады ён пайшоў у той бок, адкуль прыляцела рэха, напралом, праз кусты і зараснікі, час ад часу кідаючы свой трубны кліч таму, невядомаму...

На світанні ўбачыў саперніка. Той стаяў на паляне, закінуўшы на шырокую спіну магутныя рогі, і раз-пораз трубіў. І яму стала не па сабе. Ім апанавала рэўнасць...

Не заўважыў нават, як спляліся іх рогі... На хвіліну падалося, што не стрывае адпору, вось-вось падкосяцца ногі і ўпадзе перад чужаком на калені... І ён сабраў усе сілы, напружыўся і паваліў старога рагача на зямлю. Убачыў, як на вялікае ў чырвоных пражылках вока саперніка набегла слязіна і, утрапёны такой нечаканасцю, адскочыў і застыў-скамянеў побач...

А з асінніку цікавала за імі маладая аленіха...

ЖУРАВЫ

Іх гнала ў нялёгкую дарогу восень. І яны плылі ў сіняй бездані, пасылаючы на зямлю сваю развітальную песню. Гэта журботнае «кру-кру» падала на чараты, на прыбярэжны лазняк і памірала, прыглушанае ўсплёскамі азёрнай хвалі.

Мы сядзім у чаўне і моўчкі ўзіраемся ў неба. Я ведаю, што ў старога Андрэя шчыміць на сэрцы, і бачу, як вочы яго з сумам развітваюцца яшчэ з адным летам...

— Глядзі! Глядзі! — раптам схамянуўся стары.

Я разварочваю човен і заўважаю, як з глыбокага блакіту нібы хтосьці шпурнуў важака долу. Ён рыўкамі, як вялікі тапаліны ліст, асядае на сівы, спалавелы поплаў. А над важаком, збунтаваўшыся, кружаць і так тужліва курлыкаюць яго журавы...

— Не даляцеў. Падарваўся,— ціха, нібы сам сабе, гаворыць Андрэй.

Паспакайнелая хваля ўжо не гойдае човен. І сціхла ў вушах трывожная песня птушак. Толькі ледзь чуцён шэпт старога:

— У жорава такое здараецца на паўдарозе. І ў чалавека...

СУСЕДКА

Яна заўсёды сустракае мяне ля веснічак:

— А сёння чым павязуць сонейка?

— Пэўна, зноў самазвалам,— адказваю і абяцаю: — Вось адпачну крыху і пойдзем, паглядзім...

...І вось мы крочым у сквер. У маёй далоні ляжыць яе маленькае, цёплае і трапяткое ручаня, і нам абаім надзвычай добра... Знаёмая лавачка. Садзімся і ўглядаемся туды, дзе ў прасвеце паміж прысад белым бокам паблісквае гарбаты мост.

Зачараваная, глядзіць Ганька, як паволі апускаецца долу стомленае за дзень сонца, як у чаканні машыны прымошчваецца яно на парэнчы таго гарбатага моста...

А праз мост няспынна шыбуюць вёрткія «Запарожцы», паспешлівыя «Масквічы», самавітыя «Волгі», паважныя аўтобусы. Нарэшце, цяжка дыхаючы, на мост падымаецца працаўнік-самазвал. У гэтую хвіліну бачыць Ганька: сонца спускаецца з парэнчаў проста ў кузаў машыны...

— Павёз! — гаворыць суседка і ўсміхаецца.

А потым, калі машына згубіцца за паваротам, ідзём дадому. У маёй далоні зноў ляжыць цёплае Ганьчына ручаня. Ля веснічак дзяўчын-

ка хоча яшчэ раз пераканацца ў сваім меркаванні і пытае:

— Самазвал харошы? Праўда? Ён заўтра прывязе сонейка? Праўда?..

— Як жа без сонца? — сур'ёзна адказвае суседцы.— Прывязе. Абавязкова прывязе, Ганька!..

МАЛАДУХА-ЗІМА

Кажуць, калі клён спачатку скіне верхнія лісты,— зіма не за гарамі. Яна недзе тут, блізка. Толькі выйдзеш на гасцінец і сустрэнеш яе, ружавашчокую — у белым кажушку — маладуху.

Але на гэты раз клён падвёў мяне. Пасля першага прымаразку ён толькі ніжніх галінак скінуў на зямлю сваю пазалочаную лістоту. Верхняя засталася паціху звінець на ветры. Падумалася: «Да зімы далёка».

Ды яна з'явілася нечакана. Раніцой убачыў праз акно, як услала яна белым дыванам гасцінец і крочыла па ім, бадзёрая, у вёску. Я не меў ужо часу выбегчы на падворак...

Мне стала — не, не крыўдна, а самотна.

І клён стаяў пад акном пануры, прысаромлены, разгублены. Нібы адчуваў сваю віну перада мною.

ДЗЕД-ПРАДЗЕД

Помню, сабралася ўся наша сям'я за калядным сталом. Старэйшыя выпілі па кілішку. Наш дзед, ап'янелы ад таго кілішка, раптам расчуліўся:

— От, дзеткі, каб я быў царом...

Ад нечаканасці мы паразяўлялі раты. А дзед гаварыў:

— Каб я быў царом, нанасіў бы па вокны саломы... На саломе спаў бы, сала з салам еў бы і саломай накрываўся б...

Мы рагаталі, уяўляючы нашага дзеда ў такой выгодзе.

...З таго часу прайшло шмат гадоў. Каляд мы цяпер не спраўляем, але сустракаць Новы год збіраецца ўся наша сям'я. Пачэснае месца — прадзеду. Ён кіруе застольнай гаспадаркай, потым першы падымае чарку:

— То давайце ўжо вып'ем, дзеткі...

Праз хвілін колькі я прапаную:

— Дзеду, раскажы пра цара...

Ён спрабуе адмахнуцца:

— А можа, я не хачу быць царом.

Ледзь прыкметная ўсмешка даверліва выплёскваецца з дзедавых вачэй:

— А можа, мне і так добра.

І ўжо адкрыта, па-маладому, смяецца.

НЕДАСЛУХАНАЯ КАЗКА

На світанку да азярца ўжо каторы дзень прыбягаюць танклявыя асінкі — паглядзецца ў лясное люстэрка, пагаманіць аб нечым сваім, дзявочым, патаемным. Я тады выходжу з будана, іду да лясных чараўніц і саджуся ля іх ног. І ў сэрцы маім з'яўляецца ціхая, добрая зайздрасць. Я зайздрошчу іх шчырай непасрэднасці, маладосці і бесклапотнасці. А яны расказваюць мне дзівосную казку пра нашу зямлю.

Але ўчора не давялося даслухаць тую казку да канца. Вецер, які ўсю ноч швэндаўся недзе ў прыбярэжных лазняках, сярдзіта падляцеў да асінак, сарваў залацістае адзенне і, парваўшы ў шматкі, шпурнуў долу.

Мне стала крыўдна. І не хацеў бачыць іх распранутымі. Падняўся і пайшоў дадому.

...Па ўсёй зямлі былі параскіданы лісткі недаслуханай казкі.

КАМЕНЬ

Цэлы век ляжаў ён тут, у вёсцы. І сцены хаты надзейна абапіраліся на яго плечы. А ён знаходзіў сілы, каб не рассыпацца пад гэтым цяжарам, каб захаваць мірны спакой жыхароў. І ці не таму на яго плячах з'явіліся сінія падцёкі мазалёў, а цела пранізала вузлаватае сухажылле?

Але нядаўна гаспадар прывёў незнаёмых людзей, і тыя разбурылі старую хату, а каменю сказалі:

— Саступі месца бетону!

Ачапілі яго тросам і трактарам зацягнулі на выган:

— Ляжы!

І лёг ён у маўклівай крыўдзе. Ад нялёгкіх старэчых думак яшчэ больш выступіла маршчын... Ды аднойчы бяссоннай ноччу пачаў ён кроплю за кропляй збіраць празрыстую, як сляза, расу. І калі на світанні прыляцела сюды белагрудая весялуха-пліска, моўчкі аддаў ён дарагое пітво...

І каменю здалося, што ён усё-такі шчаслівы.

СЦЯЖЫНКА ДЗЯЦІНСТВА

Іншы раз так вось, без дай прычыны, хочацца вярнуцца ў дзяцінства. Хочацца збочыць з гасцінца і, як некалі, басанож пашыбаваць туды, дзе прызыўна шамацяць лістотай родныя прысады.

Думаецца ў такія хвіліны: хай сабе бягуць тыя шляхі-дарогі, хай клічуць няўрымслівых. Ты ж еў хлеб не з адной печы, з ліхвою паспытаў, што было адмерана мо на ўвесь твой век. І ці не заслужыў спагадлівага матчынага позірку і той невымоўнай ціхай пяшчоты, якую можа падарыць табе толькі яна, маці?

Але не пройдзена яшчэ шмат перавалаў, не зроблена таго, што хацелася б. І ты не збочваеш са свае нялёгкай дарогі, а пакідаеш убаку тыя сцяжынкі дзяцінства. І маці не крыўдзіцца. Яна разумее цябе. Бо яна — маці.

А ты назаўтра будзеш зноў цешыць сэрца надзеямі на тое спатканне і адчуваць сябе ў неаплатным даўгу перад бацькоўскім парогам.

ЗМЕСТ

Лірычныя аповесці

Буслы вяртаюцца з выраю 6
Над клёнамі — чыстае неба 47
Букет коцікаў 58
Ты пайшла ў сонца 65

Навелы

Акно 76
На відавоку 78
Бацькава песня 79
Старыя бліндажы 80
Быць пагодзе! 81
Буслы 82
Жэўжыкі 83
Дажылі, шэльмы! 84
Упарты цвік 85
Дываны 86
Мой новы знаёмы 87
Бэз 88
Пушчанская паэма 89
Рамонак на шыбіне 92
У парку 93
Бярозка 94
Касачы 95
Амяла 98
Алені 99
Журавы 103
Суседка 104
Маладуха-зіма 106
Дзед-прадзед 107
Недаслуханая казка 108
Камень 109
Сцяжынка дзяцінства 110

Пархута Я.

Ты пайшла ў сонца. Лірычныя аповесці і навелы. Мн., «Мастацкая літаратура», 1973.

112 с. 7000 экз. 12 к.

«Ты пайшла ў сонца»—першы празаічны зборнік Я. Пархуты.

У лірычных аповесцях і кароткіх навелах расказваецца пра ўзаемаадносіны людзей, пра каханне, пра жыццё, радасці і трывогі, якія выпалі на долю землякоў пісьменніка—сялян былой Заходняй Беларусі.

Клопаты пра бацькоўскі кут, любоў да роднай зямлі ніколі не пакідаюць герояў. Куды б ні закінулі іх жыццёвыя шляхі-дарогі, яны заўсёды зніταваны і сэрцам і душою са сваім Палессем.

П $\frac{0733\text{-}051}{М\ 302(05)\text{-}73}$ 79-73 Бел 2 П 18

На белорусском языке

Ярослав Сильвестрович Пархута

ТЫ УШЛА В СОЛНЦЕ

Издательство «Мастацкая літаратура» Государственного комитета Совета Министров БССР по делам издательств, полиграфии и книжной торговли. Минск, ул. Советская, 19.

Рэдактар А. Жук. Мастак М. Васалыга. Мастацкі рэдактар А. Труханава. Тэхнічны рэдактар М. Папкова. Карэктар А. Вольская.

АТ 07529. Здадзена ў набор 12/IX-1972 г. Падп. да друку 29/I 1973 г. Тыраж 7000 экз. Фармат 70×90¹/₃₂. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 4,09. Ул.-выд. арк. 3,6. Зак. 1192. Цана 12 кап.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Мінск, Ленінскі праспект, 79.